ДАЧКА КАНСТАНЦІНА ЗАСЛОНАВА – ПРА СВАЙГО БАЦЬКУ 5

ГІСТОРЫЯ ЖЫЦЦЯ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ Ў ДАКУМЕНТАХ 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

24 КРАСАВІКА 2021 г. СУБОТА № 77 (29446)

ЗВЯЗДА

Другое дыханне «чарнобыльскіх» рэгіёнаў

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА з рабочай паездкай наведала Слаўгарад

Слаўгарад — адзін з раёнаў Беларусі, які пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Напярэдадні 35-й гадавіны жудаснай катастрофы Наталля Качанава і іншыя члены Савета Рэспублікі прынялі ўдзел у памятных мерапрыемствах і паглядзелі, якім чынам ідзе развіццё Слаўгарадчыны. Таксама члены верхняй палаты парламента сталі ўдзельнікамі пасяджэння Савета ўзаемадзеяння органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі.

Фота БелТА.

Наталля Качанава і прадстаўнікі Савета Рэспублікі, Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, Слаўгарадскага райвыканкама, дэпутацкага корпуса ўсклалі кветкі і вянкі да мемарыяла пахаваных вёсак Слаўгарадскага раёна і ўшанавалі хвілінай маўчання памяць тых, хто аддаў свае жыцці за выратаванне іншых людзей пасля аварыі на ЧАЭС. На Алеі памяці прадстаўлены назвы 19 адселеных пунктаў. Усяго на Слаўгарадскай зямлі 26 вёсак, якія пацярпелі ад аварыі. Таксама, як перадае БелТА, старшыня Савета Рэспублікі прыняла ўдзел у закладцы Алеі ў гонар Года народнага адзінства, якая размясцілася ў мікрараёне Маладзёжны. Зараз там узводзіцца новы 20-кватэрны дом для маладых і шматдзетных сем'яў.

Наведваючы яслі-сад № 2 «Калейдаскоп» у Слаўгарадзе, Наталля Качанава адзначыла, што ў нашай краіне ўдзяляюць дастаткова ўвагі падтрымцы мацярынства і дзяцінства. Сучасны дзіцячы сад быў адкрыты восенню мінулага года. Дашкольная ўстанова разлічана на 75 месцаў. У садзе працуе чатыры групы, адна з якіх інтэграваная — для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы. У Слаўгарадзе працуе чатыры дашкольныя ўстановы, а ўсяго ў раёне іх восем.

Старшыня Савета Рэспублікі азнаёмілася таксама з турыстычным патэнцыялам Слаўгарадскага раёна, наведваючы помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Блакітная крыніца».

Наталля Качанава завітала і на прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад». Там яна азнаёмілася з вытворчымі памяшканнямі, дзе ў мінулым годзе адкрылі лінію па разліве мёду. У планах на найбліжэйшую перспектыву — вытворчасць манафлёрнага (сланечнікавага, рапсавага, кветкавага) і ўзбітага крэм-мёду.

Акрамя гэтага, старшыні Савета Рэспублікі паказалі, як ідзе рэалізацыя буйнога інвестыцыйнага праекта — будаўніцтва новага памяшкання на тэрыторыі «Чырвоны харчавік — Слаўгарад». Тут будзе размешчана сучасная лінія па вытворчасці мармеладу і жэлейных цукерак. Наталля Качанава падкрэсліла, што ў беларускіх прадпрыемствах ёсць усё неабходнае для стварэння канкурэнтаздольнай прадукцыі.

Таксама ў Слаўгарадзе адбылося выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. «Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў абсалютна правільнае рашэнне па развіцці рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Мы сустракаліся з людзьмі на тых аб'ектах, якія наведвалі, і яны выказвалі падзяку за тое, што зроблена з боку дзяржавы і ўрада. Дзякуючы Прэзідэнту за прынятыя праграмы па падтрымцы і развіцці гэтых рэгіёнаў. Людзі з вялікім задавальненнем гаворадь аб тым, што робіцца шмат і правільна, — сказала падчас пасяджэння Наталля Качанава. — Якія б добрыя праграмы і законы ні прымаліся, але шмат што залежыць ад таго, як яны рэалізоўваюцца. Неабходна ўсвядомлена і рацыянальна падыходзіць да іх рэалізацыі».

Адно з важных пытанняў, якое разглядалася на пасяджэнні, — работа мясцовых органаў улады. Пра гэта падрабязна — у наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».

Тут таксама — Радзіма

Фота БелТА.

32 гады таму, пасля трагедыі на Чарнобыльскай АЭС, Ева ЛЫСЯНКОВА пераехала на Віцебшчыну з вёскі Карма-Пайкі Краснапольскага раёна на Магілёўшчыне, якая трапіла ў зону адсялення. Аграгарадок Амбросавічы Шумілінскага раёна стаў для яе другім домам. Перавезла да сябе маму. Працуе ў мясцовай школе настаўніцай нямецкай мовы. Жыццё працягваецца. А ў Беларусі — паўсюль Радзіма.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:

«Заканчэнне навучальнага года супадае з пачаткам уступнай кампаніі, правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання. Таму ўсе гэтыя пытанні трэба трымаць на кантролі. Асабліва звяртаю ўвагу на арганізацыю ЦТ, якое другі год запар праходзіць ва ўмовах пандэміі. Летась былі адпрацаваныя механізмы. Але яшчэ раз варта паглядзець, як правільна наладзіць рассаджванне абітурыентаў, забяспечыць правятрывание памяшканняў, захаванне санэпідпатрабаванняў».

З нагоды

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

35 гадоў таму адбылася катастрофа на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Пераадоленне яе наступстваў — і сёння ў цэнтры дзяржаўнай палітыкі

Наступствы Чарнобыльскай катастрофы аказаліся больш цяжкімі для Беларусі, чым для суседзяў — Украіны і Расіі. Радыеактыўнае забруджванне нашай тэрыторыі склала 23 % агульнай плошчы. Для параўнання: ва Украіне гэта 7 %, у Расіі — 1,5 % тэрыторыі яе еўрапейскай часткі. Амаль на чвэрці тэрыторыі Беларусі сталі неабходныя меры надзвычайнага рэагавання. На такіх тэрыторыях апынулася больш за 3,5 тысячы населеных пунктаў, у якіх пражывала больш чым два мільёны чалавек, 479 населеных пунктаў спынілі сваё існаванне...

Але жыццё не спыняецца, і сёння ўжо можна гаварыць пра адраджэнне забруджваных тэрыторый. **Намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Пётр НІКАЛАЕНКА** адзначыў, што за пасляаварыйны перыяд тэрыторыя радыеактыўнага забруджвання цэзіем-137 з прычыны яго радыеактыўнага распаду паменшылася ў 1,8 раза і па стане на студзень бягучага года склала 25 тысяч квадратных кіламетраў, або 12 % агульнай плошчы краіны. Колькасць населеных пунктаў і аб'ектаў, якія знаходзяцца ў зонах радыеактыўнага забруджвання, на студзень 2021-га скарацілася на 144 і склала 2022, там пражывае 998 тысяч чалавек.

У аснову дзяржаўнай палітыкі па пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай катастрофы закладзены пераход ад пасляаварыйных рэабілітацыйных мерапрыемстваў да развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу пацярпелых рэгіёнаў. Прыярытэтнымі з'яўляюцца правядзенне газу да населеных пунктаў, развіццё водаправодных сетак, добраўпарадкаванне, уключаючы будаўніцтва дарог, жылля, аб'ектаў аховы здароўя, адукацыі, рэалізацыя інвестыцыйных праектаў.

«Плануецца, што ў сувязі з паляпшэннем радыяцыйнай абстаноўкі працэс вываду населеных пунктаў з зоны радыеактыўнага забруджвання працягнецца. Паводле папярэдніх разлікаў, да 2025 года колькасць населеных пунктаў, якія адносяцца да зон радыеактыўнага забруджвання, скароціцца на 273 населеныя пункты, або на 12,5 %, у параўнанні з 2016 годам», — падсумаваў Пётр Нікалаенка.

СТАР. 3

Цэнтр прыцягнення

Валерыя КЛІЦУНОВА:

«Турысты не павінны з жахам думаць, што ім рабіць у вёсцы»

Беларусь не можа пахваліцца маркімі пляжамі ці горнымі ландшафтамі, якія так любяць турысты. Але наша краіна можа ганарыцца адметнымі традыцыямі, гасцінным людзьмі, цікавымі гісторыямі, якія не пакідаюць абыякавымі. Менавіта гэта дазваляе развівацца беларускаму аграэкатурызму. На пачатак 2021 года ў краіне налічвалася 2936 аграсядзіб. З 2006 года дзейнічае Указ Прэзідэнта «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь», які прадугледжвае выгадныя ўмовы для гаспадароў аграсядзіб. Усё гэта стала магчымым дзякуючы энтузіязму аднаго чалавека — Валеры Кліцуновай, старшыні грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы». У 2000-х гадах яна павярнула ў беларускую вёску і раскрыла яе прывабнасць. «Мама» айчыннага агратурызму расказала «Звяздзе», чаму адпачынак у вёсцы можа стаць незабыўным.

СТАР. 8

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЕС плануе ўвесці да лета «зялёны сертыфікат» для перамяшчэння ўнутры саюза



Еўрапейскі саюз рыхтуецца да чэрвеня ўвесці лічбавы «зялёны сертыфікат» для перамяшчэння ўнутры ЕС і падключыць да адзінай сістэмы ўсе краіны Еўрасаюза. Аб гэтым заявіў камісар ЕС па ўнутраным рынку Цьеры Брэтон. Члены Еўрасаюза ўзгадзілі агульныя прынцыпы, якія апісваюць асноўныя тэхнічныя характарыстыкі ўкаранення сістэмы «зялёнага сертыфіката», адзінага для ўсіх краін саюза. Гэта важны крок да стварэння неабходнай інфраструктуры. Еўракамісія ў сакавіку прапанавала стварыць лічбавы «зялёны сертыфікат» для свабоднага перамяшчэння ўнутры ЕС. Ён будзе пасведчаннем таго, што чалавек вакцінаваны супраць COVID-19, мае адмоўны вынік тэста або вылечыўся ад інфекцыі. Сертыфікат будзе выдавацца бясплатна ў лічбавым або папяровым выглядзе. Камісар ЕС па пытаннях аховы здароўя і бяспекі харчовых прадуктаў Стэла Кірыакідзіс адзначыла, што вакцынацыя ў ЕС ідзе нарастаючымі тэмпамі, і грамадзяне павінны як мага хутчэй атрымаць магчымасць «рэалізаваць сваё права на свабоднае перамяшчэнне скаардынаваным і бяспечным чынам».

Французскія вінаробы спрагназавалі значны спад вытворчасці з-за халадоў

Аб'ём выкарыстанага ў Францыі віна можа скарациця сёлета даволі значна — у сярэднім амаль на трэць — з-за халадоў, якія нанеслі шкоду мясцовым вінаграднікам у красавіку. Аб гэтым паведаміла Reuters са спасылкай на арганізацыю FranceAgriMer, якая займаецца сельскай гаспадаркай. Le Figaro 10 красавіка называла халады, якія прыйшлі ў краіну, аднымі з самых сур'ёзных за апошнія дзесяцігоддзі. Па даных выдання, замаразкі закранулі 10 з 13 рэгіёнаў краіны. Як заўважаюць эксперты FranceAgriMer, шкоду павялічыла і тое, што з-за пацяплення, якое папярэднічала халадам, паскорыўся рост раслін. Сярод найбольш пацярпелых вінаробных рэгіёнаў, паводле звестак арганізацыі, — Бургундыя, Лангедок і Аквітанія, у якую ўваходзіць Бардо. Два тыдні таму ад замаразак сур'ёзна пацярпелі французскія вінаграднікі, фруктовыя сады і пасевы цукровых буракоў. Паводле папярэдніх даных, вінаробы ацанілі шкоду ад халадоў у 1,5—2 мільярды еўра.

Улады Аўстраліі накіруюць $ 77,5 млн на аздараўленне акіяну

«Урад інвестуе 100 мільёнаў аўстралійскіх долараў ($ 77,5 млн) у праграмы кіравання марскімі [экасістэмамі] і прыбярэжным асяроддзем, што дасць магчымасць унесці дадатковы ўклад у выкананне глабальнай задачы па скарачэнні выкідаў. Сродкі інвестыцыйнага пакета будуць накіраваны на падтрымку аўстралійскіх марскіх паркаў, пашырэнне ахоўных прыродных зон, а таксама на ахову марской флоры і фаўны», — адзначыў прэм'ер-міністр краіны Скот Морысан у заяве, апублікаванай на сайце ўрада. Прэм'ер-міністр таксама заўважыў, што сёння галіны, звязаныя з акіянамі, якімі абмываецца кантынент, падтрымліваюць каля 400 тысяч працоўных месцаў і, паводле прагнозаў дзяржаўнага казначэйства, у найбліжэйшае дзесяцігоддзе будуць прыносіць нацыянальнай эканоміцы не менш чым 100 млрд аўстралійскіх долараў ($ 77,5 млрд) штогод. «Акіяны маюць вырашальнае значэнне для паўсядзённага жыцця мільёнаў аўстралійцаў, каля 85 % нашага насельніцтва жывуць ў межах 50 км ад узбярэжжа. Гэтыя інвестыцыі не толькі з'яўляюцца важным укладам у эканоміку, але і стануць часткай нацыянальных і міжнародных намаганняў па аздараўленні акіянаў і барацьбе са зменай клімату», — сказаў Морысан.

КАРАТКА

- **Брэсцкая мытня за I квартал павялічыла адлічэнні ў бюджэт на 21 %.**
- Музей гісторыі Чарнобыля адкрылі ў Гомелі.
- **Краіны ЕАЭС з 2022 года пяройдуць на саюзныя правілы выдачы GMP-сертыфікатаў на лекі.**
- Сярэдні заробак у Беларусі ў сакавіку склаў Br1384,7.
- **Тавары з Беларусі першымі ўключылі ў рэестр ЕАЭС.**
- Кніга аб этнаграфіі, архітэктуры і краязнаўстве Палесся выйшла ў «Беларускай энцыклапедыі».

- **Тэхрэгламенты на будматэрыялы, будынкі і збудаванні распрацуюць у ЕАЭС.**

Свет захапленняў

«ПЯЧОРА — ГЭТА ЖЫВЫ АРГАНІЗМ»

Навошта людзі па сваёй волі лезуць пад зямлю?

На нашай планеце, здавалася б, усё ўжо вывучана. Неабсяжны свет сціснуўся да некалькіх гадзін на самалёце. Гэта так — і не так. Месцы, куды практычна не трапляла нага чалавека, — у літаральным сэнсе ў нас пад нагамі... Сёлета адзінаму ў Беларусі спелеалагічнаму клубу «Гелікцыт-ТМ» спаўняецца 50 гадоў. Кіраўнік спелеаклуба і найстарэйшы дзеючы спелеолаг Беларусі Андрэй СЦЯПУРКА расказаў, што рухае людзьмі, якія выбіраюць поўны небяспек спуск у пячоры, што яны шукаюць і што знаходзяць на гэтым шляху.

Абсалютная цемра... Каб адчуць, што гэта такое, зайдзіце ў памяшканне без вокнаў, выключыце святло, ды яшчэ і заплюшчыце вочы. Пры адсутнасці фонавага святла (а на паверхні зямлі нават ноччу не бывае поўнай цемры — заўсёды ёсць зоркі, месяц, агні гарадоў), розум спачатку малюе неверагодныя вобразы. Вопытныя спелеолагі, якія праводзяць у вечнай ночы пячор значную частку жыцця, умеюць адрозніваць адценні суцэльнай цемры. Вочы прывыкаюць, і паступова ты вучышся бачыць наноў.

— У спелеолагаў ёсць «прафесійная фішка», такі, ведаеце, пункцік — гэта літаркі, — кажа суразмоўца. — У тых, хто даўно ходзіць у пячоры, ліхтарык заўсёды з сабой. І не адзін. У мяне ліхтарыкі ўсюды: на ключах, у заплечніку, дома ліхтарыкаў шмат. Гэта нагода для жартаў, але гэта так.

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

Найлепшыя

Брэсцкую, Мінскую вобласці і Мінск занясуць на Рэспубліканскую дошку Гонару

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ нумар 158 «Аб занясенні на Рэспубліканскую дошку Гонару пераможцаў спаборніцтваў за 2016—2020 гады і за 2020 год». Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументам вызначаны рэгіёны і арганізацыі, якія ўдастоены занясення на Рэспубліканскую дошку Гонару за дасягненне высокіх вынікаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Так, па выніках работы за 2016–2020 гады сярод абласцей і г. Мінска найлепшымі прызнаны Брэсцкая, Мінская і сталіца.

Па выніках работы за 2020 год вызначаны 65 пераможцаў з ліку раёнаў, гарадоў (раёнаў у гарадах) і арганізацый. У тым ліку гэта восем адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак: Камянецкі і Кобрынскі раёны Брэсцкай вобласці, Мазырскі раён Гомельскай вобласці, Лагойскі і Нясвіжскі раёны Мінскай вобласці, Савецкі і Першамайскі раёны г. Мінска, Ленінскі раён г. Брэста; дзевяць арганізацый прамысловасці; тры арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве; дзевяць арганізацый сельскай і рыбнай гаспадаркі; дзве арганізацыі лясной гаспадаркі; 34 арганізацыі сферы паслуг (арганізацыі гандлю, адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання, навукі і іншыя, уключаючы чатыры арганізацыі аховы здароўя за самаадданую працу медыцынскіх работнікаў).

Занясенне на Рэспубліканскую дошку Гонару — грамадскае прызнанне важкага ўкладу грамадзян і калектываў прадпрыемстваў у развіццё і дабрабыт краіны. Афіцыйнае адкрыццё абноўленай Рэспубліканскай дошкі Гонару адбудзецца напярэдадні Свята працы.

«ХАТНЯЕ ЗАДАННЕ» ДЛЯ ВЕРТЫКАЛІ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА правёў прыём грамадзян ва Ушачах

Фота БелТА.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас прыёму грамадзян у райцэнтры разгледзеў пытанні пенсійнага, медыцынскага забеспячэння, добраўпарадкавання жыллля і рамонту дарогі, паведаміла БелТА.

Заяўніца з Ушачаў узняла пытанне зняцця яе з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў. Па законе жанчына мае дастаткова квадратных метраў і прэтэндаваць на новае жыллё не можа. Яшчэ яна выказала меркаванне, што да правядзення раённых і мясцовых мерапрыемстваў — не толькі культурна-масавых, але і грамадзянска-патрыятычных — трэба больш актыўна прыцягваць моладзь. Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што апошнім часам маладое пакаленне актыўна далучаюць да грамадскага жыцця краіны, і калі на месцах школьнікі не наведваюць падобныя мерапрыемствы, то пытанне — да раённых уладаў. Прадстаўнікі райвыканкама пазней распавялі, што моладзь заўсёды ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ў раёне, і толькі падчас пандэміі дзяцей не прыцягвалі. Ушачанка папрасіла таксама садзейнічання ў медабслугоўванні: ёй патрэбна хірургічная аперацыя, і жанчына хацела б трапіць да добрага спецыяліста. Уладзімір Андрэйчанка даў даручэнне заняцца гэтым пытаннем і дапамагчы пенсіянерцы.

У жыхара Ушачаў праблема ў неаспрэчнасці пенсіі ў доме, што знаходзіцца на балансе ЖКГ, куды ён усяліўся з родным братам. Мужчына сцвярджае, што печ была ў нездавальняючым стане перашпаткаткова. Старшыня Палаты прадстаўнікоў даў даручэнне ў месячны тэрмін работнікам ЖКГ адрамантаваць печ і параіў заяўніку будаваць жыллё за кошт ільготнага крэдыту, на які мужчына мае права.

Жыхар вёскі Лутава Сяльцо звярнуўся з пытаннем наконт пенсійнага забеспячэння. Пенсія яму магла быць прызначана датэрмінова, але дакументы, якія пацвярджаюць выкананне работ са шкоднымі ўмовамі працы, згарэлі на прадпрыемстве, дзе працаваў мужчына. І той арганізацыі ўжо таксама няма, яна ліквідавана. У архіве звестак пра спецыфіку працы заяўніка няма: кіраўнік не адпраўляе іх туды. Уладзімір Андрэйчанка парэкамендаваў вырашыць пытанне ў судовым парадку.

Калектыўны зварот пенсіянераў з райцэнтра дытычыўся рамонту дарогі на адной з вуліц. Кіраўніцтва райвыканкама адзначыла, што ва Ушачах ёсць вуліцы больш праблемныя, рамонт якіх ужо ўнесены ў планы на гэты год. Вуліцу Маладзёжную, дзе, па словах тых, што звярнуўся, неабходна замяніць дарожнае палатно, прагрэйдзіруюць і ўнясуць у планы на рэканструкцыю на наступны год.

Па выніках прыёму Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што такія сустрэчы з грамадзянамі дапамагаюць глыбей даведацца праблемы рэгіёнаў. «Прыёмы грамадзян часам становяцца «хатнім заданнем» для прадстаўнікоў дзяржаўнай улады. Многія пытанні мы ўлічваем у заканадаўчай практыцы», — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Спорт

Нацыянальны форум атлетаў стартаваў у Мінску

Гэта першае падобнае мерапрыемства і новы крок у спартыўным партнёрстве

Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь прымае першы «Нацыянальны форум атлетаў», які праходзіць у фармаце адукацыйнага семінара-канферэнцыі. Галоўная тэма мерапрыемства — сацыялізацыя прафесійных спартсменаў пасля заканчэння спартыўнай кар'еры, выкарыстанне іх патэнцыялу ў развіцці спартыўнай індустрыі. Таму і назва адпаведная — «Кіраванне кар'ерай у спорце і развіццё асабістага брэнда спартсмена».

«На гэтым форуме ўпершыню сабраліся як дзейсныя спартсмены, так і тыя, хто ўжо завяршыў кар'еру. Упэўнены, для ўсіх вас гэта будзе карысны абмен вопытам. Рана ці позна спартсменам даводзіцца заканчваць кар'еру. Як правільна пабудаваць сваё жыццё пасля гэтага кроку, падзелящца вопытным настаўнікі. У нашай краіне ўдзяляецца вялікая ўвага як дзеючым, так і легендарным спартсменам. Вы слухаеце прыкладам для нашага падрастаючага пакалення, якое, гледзячы на вас, вучыцца не толькі таму, як дасягаць вяршыняў у вялікім спорце, але і як знайсці сябе ў жыцці пасля завяршэння кар'еры», — адзначыў **прэзідэнт НАК Беларусі Віктар ЛУКАШЭНКА,** вітаючы ўдзельнікаў форуму.

На два дні, 23—24 красавіка, беларускія атлеты і прадстаўнікі спартыўнай грамадскасці адчуюць сябе студэнтамі. З адпаведнымі выступленнямі і лекцыямі выступяць прадстаўнікі Расійскага міжнароднага алімпійскага ўніверсітэта, які дзейнічае ў Сочы, сталіцы Алімпійскіх гульняў 2014.

«У сусветным спорце ёсць вялікая праблема — праблема адаптацыі спартсменаў да жыцця пасля завяршэння спартыўнай кар'еры. І мы сваю місію бачым у тым, каб даць спартсменам магчымасць знайсці сваё месца, сваю справу пасля завяршэння кар'еры: мы даём ім інструмент, спецыялісцаў, якія ім блізкая. Гэта спецыяльнасць спартыўнага менеджара, універсальная спецыяльнасць», — адзначыў **рэктар РМАУ Леў БЕЛАВУСАЎ.**

Паміж беларускім Нацыянальным алімпійскім камітэтам і РМАУ падпісана пагадненне аб партнёрстве. Беларускія спецыялісты і спартсмены рэгулярна выязджаюць на вучобу ў Сочы. Як адзначыў Леў Белавусаў, было вырашана працягваць гэта партнёрства і пашырыць яго. І Нацыянальны форум атлетаў — першая спроба новых сумесных праектаў.

Хэдлайнерам форуму стала **двухразовая алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы Святлана ХОРКІНА.** «У нас, у спартсменаў, два жыцці — спартыўнае і грамадзянскае. Спартсменам, якія завяршылі актыўную кар'еру, важна дапамагчы з выбарам прафесіі і адаптацыяй да ўмоў у новым жыцці. Вельмі добра, што ў сучасных атлетаў ёсць магчымасць наведваць семінары, прысвечаныя гэтай праблеме, і вучыцца рабіць сваю будучыню ў кваліфікаваных спецыялістаў, а не дзейнічаць метадам уласных спроб і памылак, як гэта было раней», — адзначыла легендарная спартсменка.

Сваімі гісторыямі адаптацыямі да «нespартыўнага жыцця» падзяліліся і беларускія атлеты: Любоў Чаркашына, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў 2012 года, біятланістка Ганна Сола, якая потым вярнулася ў спорт. «Пасля заканчэння спартыўнай кар'еры я часта ўспамінаў словы сваіх настаўнікаў. Яны заўсёды казалі, што, акрамя спорту, патрэбна вучыцца і развівацца, бо спартыўнае жыццё вельмі хуткае», — адзначыў **Дзмітрый ДАЎГАЛЁНАК, алімпійскі чэмпіён 1992 года, віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі.**

Усяго ўдзел у форуме прынялі больш за 150 прадстаўнікоў спартыўнай сферы: атлеты, трэнеры, кіраўніцтва. Пасля завяршэння форуму атлетаў усе яго ўдзельнікі атрымаюць сертыфікаты РМАУ міжнароднага ўзору, якія пацвярджаюць удзел у адукацыйным семінары ў аб'ёме 16 гадзін.

Валерыя СЦЯЦКО.

Ва ўрадзе

У АДКАЗ НА НЕДРУЖАЛЮБНЫЯ ДЗЕЯННІ

Забаронены ўвоз і рэалізацыя шэрагу тавараў

Для забеспячэння абароны нацыянальных інтарэсаў, з улікам недружалюбных дзеянняў у дачыненні да беларускага народа ўрадам устаноўлены пералік тавараў, забароненых да ўвозу і рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі. Адпаведнае рашэнне замацавана пастановай Савета Міністраў ад 23 красавіка 2021 г. № 240.

Дакумент прыняты ў адпаведнасці з Указам № 128 «Аб прымяненні спецыяльных мер», якім прадугледжваецца ўвядзенне забароны на ўвоз на тэрыторыю Беларусі і рэалізацыю асобных груп тавараў (у тым ліку тавараў асобных вытворцаў), краінай паходжання якіх з'яўляюцца дзяржава і (або) аб'яднанне дзяржаў, якія прынялі рашэнне аб увядзенні спецыяльных мер у дачыненні да беларускіх юрыдычных і (або) фізічных асоб або якія далучыліся да гэтых мер.

У пералік забароненых тавараў унесены тавары груп кампаній LIQUI MOLY, SKODA AUTO і BEIERSDORF (гандлёвыя маркі NIVEA, EUCERIN, LA PRAIRIE, LABELLO, HANSAPLAST, FLORENA, 8X4, SKIN STORIES, GAMMON, TESA, CHAUL, COPPERTONE, HIDROFUGAL, STOP THE WATER WHILE USING ME).

Пастановай таксама зацвярджана палажэнне аб парадку дзеянняў у дачыненні да забароненых тавараў.

Так, у выпадку выяўлення забароненых тавараў пры ўвозе ў Беларусь яны будуць падлягаць зваротнаму вывазу з тэрыторыі краіны. У выпадку выяўлення забароненых тавараў у гандлёвых аб'ектах, на рынках, выставах, кірмашах, у інтэрнэт-крамах і сетцы Інтэрнэт асобам, якія ажыццяўляюць такі гандаль, будзе выдавацца прадпісанне на забарону іх рэалізацыі.

Пастанова не распаўсюджваецца на ўвозімыя грамадзянамі ў Беларусь тавары для асабістага карыстання, транспартныя сродкі, названыя ў пастанове, якія зарэгістраваныя ў дзяржавах — членах Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама часова ўвозяцца на мытную тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза транспартныя сродкі.

Пастановай таксама вызначаны парадак рэалізацыі рэшткаў забароненых тавараў, уведзены у нашу краіну да ўступлення ў сілу пастановы.

«Суб'екты гандлю, у якіх на дату ўступлення ў сілу пастановы будуць знаходзіцца рэшткі забароненых тавараў, прыпыняюць аптовы і (або) рознічны гандаль такімі таварамі, на працягу пяці рабочых дзён правядзяць інвентарызацыю іх рэшткаў і афармляюць Інвентарызацыйны вопіс. Пасля гэтага не пазней за пяць рабочых дзён з даты яго складання прадстаўляюць два асобнікі ў падатковую інспекцыю па месцы пастаноўкі на ўлік і на працягу 60 каляндарных дзён забяспечваюць маркіроўку рэшткаў такіх тавараў адмыслоўмі кантрольнымі знакамі, якія нанясяцца на спажывецкую ўпакоўку тавару», — распавялі ў прэс-службе ўрада.

Пасля маркіроўкі рэшткаў такіх тавараў можна працягнуць іх далейшую рэалізацыю. Асобы, якія парушаюць дадзеную забарону, будуць прыцягвацца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Асноўныя пункты пастановы ўступаюць у сілу праз дзесяць дзён пасля афіцыйнага апублікавання дакумента. Устаноўлены пералік забароненых тавараў сапрацўнік на працягу шасці месяцаў.

БелТА.

Прыгажуні, спартсменкі і бізнесменкі

Удзельніцы праграмы падрыхтоўкі да мінскага гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу грацыі і таленту «Каралева студэнцтва» наведалі Палац Незалежнасці. Чарговая экскурсія арганізавана для канкурсантак і каардынатараў мерапрыемства, якія прадстаўляюць разнастайныя сталічныя ВНУ. Карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася з грацыямі і даведалася пра сучасныя патрабаванні да прэтэндэнтак на званне каралевы прыгажосці.

Фота БелТА.

Вандроўка па рэзідэнцыі Прэзідэнта Беларусі, як звычайна, пачалася з залы ўрачыстых цырымоній — адной з найважнейшых пляцовак у краіне, дзе сустракаюць міжнародныя дзелегацыі, праводзяць сустрэчы з дзеячамі культуры, балы і ўручаюць ганаровыя званні. Экскурсавод Александрына паведаміла дзяўчатам, што палац мае 100 памяшканняў, пятая частка з іх выкарыстоўваецца для прыёму гасцей. Навуковы супрацоўнік нагадала пра стаханаўскую працу будаўнікоў і перавыкананне плана па ўзвядзенні рэзідэнцыі, пра тое, што галоўнай тэмай архітэктуры і дызайну памяшканняў сталі слуцкія паясы, раскасала пра шыкоўны сад з вішнямі, абрыкосамі, яблынямі і слівамі. Безумоўна, юным прыгажуням урачыстыя залы прыйшліся даспадобы, і кожная з іх з радасцю рабіла сэлфі за трыбунай, на фоне дзяржаўных сімвалаў.

Гэтым часам журналісты спрабавалі адцягнуць ад экскурсіі некаторых з канкурсантак і даведацца, чым яны будуць пакарацьадыторыю і журы падчас фіналу. Будучы эканаміст-менеджар з Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Аляксандра Піскун на этапе адбору ва ўніверсітэце выступала з усходніні танцамі, а зараз мякруе прадставіць іншы нумар. Дзяўчына сцвярджае, што «Каралева студэнцтва» — конкурс не толькі пра прыгажосць, але і пра таленты, духоўныя якасці, прамоўніцкае майстэрства. Аляксандра не хавае, што, акрамя новых знаёмстваў, удзел у конкурсе адкрывае магчымасці трапіць у мадэльнае агенцтва ці на тэлеэкран.

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ілона Жэгждрынь, верагодна, будзе ўражваць суддзяў сваімі вакальнымі талентамі. Яна спявае ў калектыве «Валачобнікі», працуе настаўніцай у школе, выкладае эстрадны вакал для падлеткаў і дарослых ва ўласнай студыі, якую аформіла на правах індывідуальнага прадпрымальніка. Дзяўчына адзначае, што вельмі любіць беларускую народную культуру, бо сама родам з невялікай вёскі на Гродзеншчыне. На яе малой радзіме шмат моладзі, якая нацэлена на развіццё населенага пункта: будуе дамы, добраўпарадкоўвае тэрыторыю.

Яшчэ адна ўдзельніца конкурсу, Ксенія Здрок, курсант авіяцыйнага факультэта Ваеннай акадэміі, сцвярджае, што вышэй-шы столяй Палаца Незалежнасці не парауніць з вышынёй, якую набірае верталёт ці самалёт, але ўбранне будзінка яе ўсё ж такі вельмі ўразіла, і кожная зала мае свае асаблівасці. Не толькі з-за афіцэрскага абавязку, але і з уласных перакананняў дзяўчына кажа, што наша краіна самая лепшая. На пытанне журналістаў, чаму яна выбрала ваенную службу і ці ёсць адрозненні ў патрабаваннях да дзяўчат і хлопцаў у Акадэміі, адказвае: марыла пра гэта з дзяцінства. І дадае, што ў ВНУ ўсе роўныя — ваеннаслужачых не падзяляюць на дзяўчынак і хлапцоў.

Анастасія Пармон — будучы машынабудаўнік, вучыцца ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. На пытанне пра выбар таксама такой не вельмі ўласцівай для дзяўчыны прафесіі адказвае, што зрабіла яго пад уплывам бацькоў — працягвае дынастыю. Як тата і мама пазнаёміліся на гэтым жа факультэце, а дзядуля выкладаў у БНТУ. Вучобу, работу ў бацькоўскай фірме, рэдактарскую справу ў факультэцкай газеце і грамадскую дзейнасць яна паспявае сумяшчаць з мадэльнай прафесіяй.

Конкурс «Каралева студэнцтва» праходзіць як нацыянальны адбор для ўдзелу прадстаўніц Беларусі ў міжнародным конкурсе прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2021», арганізатарамі якога з'яўляюцца БРСМ і Расійскі саюз моладзі. Фінальнае рэспубліканскае шоу запланавана на канец мая, пасля чаго дзяўчаты пройдуць кваліфікацыйны адбор, сумуюе і пасля гэтага атрымаюць права ўдзелу ў суперфінале.

Марыя ДАДАЛКА.

Сацыяльны вектар

Атрымаць неабходны вопыт

з дапамогай службы занятасці

Службай занятасці арганізавана набыццё практычнага вопыту для беспрацоўных. Так, толькі за першыя два месяцы 2021 года атрымалі такую магчымасць 77 чалавек.

Паслугай скарысталіся 28 беспрацоўных у Гомельскай вобласці, па 13 — у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, 9 — у Віцебскай, 7 — у Магілёўскай, у Мінскай вобласці — 3, а ў сталіцы — 4.

Для набыцця вопыту практычнай работы па атрыманай прафесіі (спецыяльнасці) накіроўваюцца беспрацоўныя, зарэгістраваныя ў службе занятасці, з ліку выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю; асобы, якія прайшлі прафесійную падрыхтоўку ці перападрыхтоўку па накіраванні службы занятасці, і людзі, якія доўгі час (больш за 12 месяцаў) не працавалі ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама дзіцяці ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага вірусам імунадэфіцыту чалавека ці хворага на СНД.

З беспрацоўным заключаецца тэрміновы працоўны дагавор на перыяд ад 2 да 6 месяцаў.

Найбольшым, якія даюць працоўныя месцы для працаўладкавання беспрацоўных з мэтай набыцця вопыту практычнай работы, службай занятасці часткова кампенсуюцца затраты на аплату іх працы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Блізкая ўлада

Як праблема становіцца невырашальнай

Што робіцца ў Магілёўскай вобласці, каб не было фармалізму ў рабоце са зваротамі грамадзян

Падчас апошняга прыёму грамадзян у Магілёве старшыня аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ вельмі жорстка выказаўся пра ўзровень работы на месцах са зваротамі грамадзян. Ён пакрытыкаваў адказных асоб за непрынятае мер і чэрствае стаўленне да заяўнікаў. «Нам, прадстаўнікам улады, неабходна па-гаспадарску падысці да гэтых пытанняў, — аргументаваў ён. — Вельмі часта яны не патрабуюць вялікіх фінансавых выдаткаў. Працаваць трэба, улічваючы інтарэсы людзей, а не займацца адпіскамі».

Разам з упраўленнем на рабоце па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама «Звязда» прааналізавала якасць работы на месцах.

На што скардзімся?

Летась органамі выканаўчай улады была праведзена 1201 сустрэча «прамая тэлефонная лінія», паступіла 6205 зваротаў — на 7 % больш, чым у 2019 годзе. Акрамя гэтага, падчас асабістых прыёмаў на розных узроўнях было прынята больш чым 8,5 тысячы чалавек. Усяго ў мясцовых выканаўчых і распарадчых органы вобласці паступіла 15 474 звароты ад грамадзян і 1030 — ад юрыдычных асоб — 104 % і 98 % да ўзроўню 2019 года.

Амаль палова зваротаў датычылася жыллёва-камунальнай гаспадаркі і жыллёвага фонду, актуальнымі былі пытанні архітэктуры і будаўніцтва, землеўпарадкавання, занятасці насельніцтва, аховы працы. Тэматыка некаторых зваротаў мела асаблівасці. На характар і дынаміку паўплывалі грамадска-палітычныя падзеі ў краіне і неспрыяльныя эпідэміялагічныя ўмовы. На пытанняў «Дзяржава», «Грамадства», «Палітыка» колькасць зваротаў павялічылася больш чым у два разы — з 52 да 113. Адбыўся скачок і медыцынскіх пытанняў. Грамадзяне звярталі ўвагу на неабходнасць прыняцця прафілактычных мер для недапушчэння распаўсюджвання каранавіруса, санітарнай апрацоўкі месцаў агульнага карыстання жылых дамоў; паведамлялі пра загружанасць медыцынскіх устаноў, наяўнасць чэргаў пры чаканні прыёму ўрача, парушэнні часу прыёму, названа ў талоне, несвоечасовае аказанне медыцынскай дапамогі і іншыя.

Звароты, якія... праігнаравалі

Пытанні бываюць розныя, у тым ліку і такія, якія сапраўды на месцах не вырашыць. Але незразумела, што перашкаджае, умоўна кажучы, лямпачку ў ліхтары памяняць або дамафон паставіць? Бо калі падобныя скаргі выходзяць на абласны або рэспубліканскі ўзровні, мясцовым службам прыходзіцца не толькі разбірацца з праблемай, але яшчэ і несці адказнасць за валакіту. Некалькі прыкладаў таго, як гэта адбываецца.

З Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Магілёўскі аблвыканкам паступіў зварот жыхаркі Бушлякі Шклоўскага раёна, якая паскардзілася на нізкія спажывецкія якасці дадзенага ёй арэнднага жылля. На месцы, удакладніла яна, праўды не падбіцца. Была зроблена праверка, і высветлілася, што скарга абгрунтаваная. За парушэнне патрабаванняў жыллёвага заканадаўства вінаватыя службовыя асобы Каменналаўскага сельвыканкама і Шклоўскага прадпрыемства «Жылкамгас» прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

Пацвердзіўся факт несвоечасовага выканання заявак праз службу «Кантакт-цэнтр 115», пра што паведаміў у сваёй электроннай скарзе мужчына з Магілёва. Праблема датычылася нездавальняльнага ацяплення кватэры. Вінаватыя службовыя асобы ЖЭУ-17 таксама адказалі за сваю нядбайнасць.

У Бабруйску непаваротлівасць камунальнікаў таксама прымусіла жыльцоў шукаць праўды ў вышэйшых інстанцыях. Яны прасілі «Бабруйскжыллкамгас» аднавіць ім ўваходную групу ў пад'езд. Там паабяцалі зрабіць работы да восені і забыліся. Цярпенне ў людзей скончылася. Толькі пасля таго, як іх ліст з Адміністрацыі Прэзідэнта вярнуўся на разгляданне ў вобласць, меры былі прыняты, а вінаватыя пакараны.

Як і ў выпадку з непрыняццем своечасовых дзеянняў па аднаўленні падачы вады ў адну з кватэр дома па вуліцы Ульянаўскай у Бабруйску. Надзвычайная сітуацыя адбылася ў лютым, і халатнасць адказных асоб прывяла да таго, што прамёрз водаправод.

— Нягледзячы на аб'ектыўнасць прычын, з якімі звяртаюцца грамадзяне, своечасовыя меры па ліквідацыі недахопаў не заўсёды прымаюцца, — канстатуе **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Іна ФІЛІПАВА.** — Значная частка паўторных зваротаў абумоўлена менавіта недапрацоўкамі на месцах. Найбольш праблемныі ў выражэнні з'яўляюцца пытанні камунальна-бытавой гаспадаркі і добраўпарадкавання, рамонтна-будаўнічых работ, па-сцвярджаліся факты парушэнняў аплаты, умоў і арганізацыі працы і іншыя. Звароты грамадзян, якія паступаюць у аблвыканкам, у тым ліку падчас правядзення «прамых тэлефонных ліній», сведчаць і пра не зусім дастаткоую работу з насельніцтвам сельвыканкамаў. Яны не заўсёды забяспечваюць узаемадзеянне з адпаведнымі арганізацыямі, якія аказваюць паслугі насельніцтву для вырашэння праблемных пытанняў. Са скаргамі на адсутнасць рэагавання ў сельвыканкамах у аблвыканкам звярталіся з вёсак Сялец і Нікіцінічы Магілёўскага раёна, Чавусаў. Пытанні датычыліся аказання дапамогі ва ўборцы збожжа на прысядзібным зямельным участку, аднаўленне вулічнага асвятлення, адсутнасці пад'езду да грамадзянскіх могілак, пакосу травы.

Прыклады працягваюцца

За парушэнні заканадаўства аб зваротах да дысцыплінарнай адказнасці за мінулы год прыцягнуты 442 службовыя асобы, да адміністрацыйнай — 22. А гэта ўжо зусім свежыя факты. Жыхарка Бялыніч цэлы год вырашала пытанне з устаноўкай дамафона ў новым доме. Заяўніца з гарадскога пасёлка Краснаполле не магла дабіцца, каб якасць пітной вады прывялі ў адпаведнасць з санітарнымі нормамі. На працягу тыдня так і не вырашыла праблему з рамонтам водаразборных калонак жыхарка вёскі Барсукі Шклоўскага раёна. У Магілёве камунальнікі выпрабоўвалі на трываласць нервы грамадзянкі, якая прасіла капіраваць бярозу пад яе акном. Галоўнае — не адмовілі, але выконваць абяцанне не спяшаліся. Яшчэ адна магілёўчанка двойчы бязвынікова звярталася наконт арганізацыі вулічнага асвятлення і вёсцы Дубінка-2. Жыхарка аграгарадка Гарбавічы Чавускага раёна тры месяцы дабівалася ад мясцовых службаў вырашыць праблему з іржавай вадой. На тры гады расцягнулася справа з асвятленнем вуліцы ў вёсцы Дабрылавічы каля дома заяўніцы з Бялыніч. Жанчына неаднаразова звяртался з гэтым пытанням у сельвыканкам і нават Бялыніцкі райвыканкам. Усе гэтыя праблемы вырашыліся толькі пасля звароту ў Магілёўскі аблвыканкам. Прычым на карысць заяўніка. А вось тыя, хто іх валакіцуў, сваё рэнамэ адчувальна сапсавалі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Размова па сутнасці

ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

Як рэгіёны, пацярпелыя ў выніку аварыі на ЧАЭС, пераходзяць ад поставарыйных рэабілітацыйных мерапрыемстваў да развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу

Падчас круглага стала «Чарнобыль праз 35 гадоў: вынікі і праблемы» парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх і навуковых арганізацый абмеркавалі пытанні пераадолення наступстваў катастрофы, тэндэнцыі ў галіне сацыяльнай аховы і медыцынскай дапамогі, развіцця пацярпелых тэрыторый.

Сацыяльная абарона — у прыярытэце

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Мікалая ВАСІЛЬКОВА,** на дзяржаўным узроўні быў прыняты шэраг мер, якія заблыснечылі і сацыяльную абарону, і сацыяльна-эканамічнае развіццё на пацярпелых тэрыторыях. У іх аснове — Законы «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падверглісяradыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» (1990 год), а таксама Закон «Аб радыяцыйнай бяспецы» (1998 год).

— З улікам практыкі правапрымянення ў гэтыя заканадаўчыя акты ўносіліся змены, яны выйшлі ў новых рэдакцыях і сёння поўнасцю адпавядаюць усім патрэбнасцям у сацыяльнай абароне грамадзян, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, і асоб, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, — падкрэсліў Мікалай Андрэевіч. — Рацыянальнае і эфектыўнае выкарыстанне матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў на рэалізацыі мерапрыемстваў па мінімізацыі наступстваў аварыі абумовіліі неабходнасць стварэння чарнобыльскіх праграм — як на дзяржаўным, так і на саюзным узроўнях.

Сёння ў краіне дзейнічае нарматыўнаправавая база, накіраваная на ахову праваў і інтарэсаў грамадзян, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы, якія пражываюць ці выехалі з тэрыторый радыяцыйнага забруджвання; на правядзенне прыродаднаўленчых і ахоўных мерапрыемстваў; на рацыянальнае выкарыстанне прыроднага, гаспадарчага і навуковага патэнцыялу гэтых тэрыторый.

— З 1986 года плошча тэрыторыі рэспублікі ўзяием-137 — асноўным радыенуклідам, які больш чым на 90 % вызначае дозу апрамянення насельніцтва, з-за яго радыеактыўнага распаду зменшылася ў 1,8 раза і складае сёння 25 тысяч км², — адзначыў **Сяргей ШПАРЛО, начальнік Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — Паступова скарачаецца і спіс населеных пунктаў і аб'ектаў, якія знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання. На сёння гэта 2022 населеныя пункты, дзе пражывае 998 тысяч чалавек.

За гэты перыяд было рэалізавана пяць дзяржаўных праграм па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. А ў сакавіку 2021 года зацвярджана шостая, разлічаная на 2021—2025 гады.

— Яе асноўныя мэты і задачы — сацыяльная абарона насельніцтва, адраснае прымяненне ахоўных мер у сельскай гаспадарцы, паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў, навуковая дзейнасць і інфармацыйная работа, — расказаў Сяргей Шпарло. — У дакументе з'явіўся і новы раздзел «Удасканаленне арганізацыі санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення дзяцей, якія пражываюць (вучацца) на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання». Плануецца палепшыць матэрыяльную базу дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў, такіх як «Надзея» і «Жамчужына», якія штогадова прымаюць дзяцей з

Фота Belta

пацярпелых раёнаў. Усяго на рэалізацыю мерапрыемстваў дзяржпраграмы прадугледжаны тры мільярды рублёў, больш за палову з якіх пойдзе на сацыяльную абарону насельніцтва.

На словах спецыяліста, у аснове дзяржпалітыкі па пераадоленні чарнобыльскай катастрофы закладзены пераход ад поставарыйных рэабілітацыйных мерапрыемстваў да развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу пацярпелых рэгіёнаў.

Дапамога фінансавая і медыцынская

Наменскі міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ расказаў пра некаторыя льготы, якія маюць грамадзяне, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Для асоб, якія жывуць і працуюць на тэрыторыях радыеактыўнага забруджвання, устаноўлены 35-гадзінны працоўны тыдзень, пры гэтым заработная плата адпавядае 40 гадзінам, павялічаны памеры дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Павышана таксама працягласць працоўнага адпачынку, а адпачынак па цяжарнасці і родах даецца з 27 тыдняў цяжарнасці.

Існуе шэраг ільгот і ў галіне пенсійнага забеспячэння. У асноўным падтрымку атрымліваюць ліквідатары і асобы, што сталі інвалідамі з прычыны катастрофы. У 2020 годзе такімі льготамі скарысталіся больш за 46 тысяч чалавек.

— На стане на 1 студзеня 2021 года ў Беларусі пражывала 1,463 млн чалавек, якія адносяцца да пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС, у тым ліку 239,4 тысячы дзяцей, — расказаў **начальнік аддзела медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Аляксандр ПАНЦЮХОЎ.** — На дыспансерным уліку ў арганізацыях аховы здароўя знаходзіласяся 45 897 чалавек.

На словах спецыяліста, дзякуючы эфектыўнай сістэме дыспансерызацыі, за апошнія гады не адбылося істотнага павелічэння групы з хранічнымі захворваннямі, нягледзячы на старэнне кантынгенту (сярэдні ўзрост ліквідатара — 63 гады, эвакуіраваных грамадзян і тых, хто пастаянна пражывае на забруджаных тэрыторыях, — 47 гадоў). Пры гэтым пацярпелае насельніцтва пакутуе на тыя ж захворванні, што і астатнія жыхары краіны: гэта хваробы органаў дыхання, траўмы і атручванні, захворванні касцёва-мышачнай сістэмы. Адпаведная агульнарэспубліканская і карціна смертнасці: лідзіруюць захворванні сістэмы кровазвароту, новаўтварэнні і знешнія прычыны.

Паступова ўдакладняецца і спіс захворванняў, звязаных непасрэдна з радыяцыйным фактарам. Па словах **дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Аляксандра РАЖКО,** для гэтага спецыялісты праводзяць карпатлівую работу ў пошуках доказаў, вывучаюць архіўныя даныя, абмеркоўваюць інфармацыяй з расійскімі і ўкраінскімі калегамі. Пры гэтым для кожнага чалавека гэтае пытанне вырашаецца індывідуальна з улікам комплексу фактараў.

Дзякуючы намаганням з боку дзяржавы, штогод са сродкаў рэспубліканскага бюджэту павялічваецца фінансаванне на аздараўленне насельніцтва, пацярпелага ад катастрофы на ЧАЭС, асабліва дзяцей, падкрэсліў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.** Калі ў 2016 годзе лячэнне і аздараўленне праходзіла 82 тысячы дзяцей, якія маюць адпаведныя медыцынскія паказанні, на што было выдзелена каля 72 млн рублёў, то ў 2019 годзе — ужо 87 тысяч дзяцей і амаль 90 мільёнаў рублёў адпаведна. Сродкі на арганізацыю лячэння і аздараўлення выдзяляюцца і з бюджэту Саюзнай дзяржавы.

Працяг ёсць

Аляксандр КАНАВАЛЬЧЫК, начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, адзначыў, што праз 35 гадоў пасля аварыі радыяцыйнае становішча на забруджаных тэрыторыях стабільнае, кантраляванае, прадказальнае. Ідзе зніжэнне ступені радыяцыйнага забруджвання за кошт натуральных працэсаў. Згодна з класіфікацыяй МАГАТЭ, сітуацыя ў Беларусі характарызуецца як сітуацыя існуючага апрамянення.

Працягваецца жыццё і на самай забруджанай частцы краіны — на тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Як расказаў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце гэтай установы Максім КУДЗІН,** сёння даследчыкі вывучаюць пытанні назапашвання і пераносу радыенуклідаў у розных асяроддзях, відах жывёл і раслін, выкіды радыенуклідаў у выніку стыхійных бедстваў.

Цікавая для вучоных і сама тэрыторыя запаведніка. Яна мае высокую каштоўнасць як ключавая батанічная тэрыторыя, з'яўляецца патэнцыйным Рамсарскім угоддзем. Акрамя арнітафаўны, тут актыўна вывучаюцца і папуляцыі капытных.

На перспектыву ў запаведніку плануецца ацэнка стану радыеактыўных апададу, якія захоўваюцца на яго тэрыторыі. Плануецца пашырыць вывучэнне відавой разнастайнасці, у тым ліку іхтыяфаўны. Разглядаюцца пытанні стварэння міжнароднага асветніцкага цэнтра і цэнтра інтрадукцыі для ўзнаўлення рэдкіх відаў жывёл, а таксама абмяркоўваецца магчымасць надання Палескаму запаведніку статусу асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі.

Вераніка КОЛАСАВА.

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Начальнік упраўлення рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Юлія БАЙКОВА нагадала, што сёлета ў сакавіку года была зацверджана новая Дзяржаўная праграма на 2021—2025 гады, у якой былі захаваны асноўныя падыходы фарміравання ахоўных мерапрыемстваў у сельскагаспадарчай вытворчасці. На яе рэалізацыю запланавана каля 3 мільярдаў рублёў. «Радыелагічнае абследаванне праведзена на 1,2 мільёна гектараў сельгасзямель. Вапнаванне кіслых глеб, унясенне павышаных доз калійных і фосфарных угнаенняў дазволіла істотна знізіць пераход радыенуклідаў у прадукцыю раслінаводства і жывёлагадоўлі. Правядзенне ахоўных мерапрыемстваў у далейшым дасць магчымасць падтрымліваць на патрэбным узроўні вытворчасць прадукцыі, адпаведнай рэспубліканскім і міжнародным нарматывам», — дадала спецыяліст.

Рашэнне аб вяртанні радыяцыйных зямель у карыстанне прымаецца Саветам Міністраў толькі пасля ўсебаковай ацэнкі меркаваных наступстваў, якая пацвердзіць бяспеку работнікаў, а таксама магчымасць вытворчасці на такіх землях нарматыўнай чыстай прадукцыі, заўважыла спецыяліст.

Канцэнтрацыя радыенуклідаў цэзію-137 і стронцыю-90 у глебе зараз зменшылася амаль на палову па прычыне натуральнага распаду, адзначыла **загадчыца сектара сельскагаспадарчай радыялогіі і аховы навакольнага асяроддзя Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ірына КУЧЫНСКАЯ.** «Аднак наступствы Чарнобыльскай катастрофы носяць доўгачасовы характар, і праблему атрымання якаснай самаакупнай сельскагаспадарчай прадукцыі на радыеактыўна забруджаных землях пакуль нельга лічыць да канца вырашанай, — адзначыла яна. — Пытанні, як правіла, сканцэнтраваліся ў тых сельскагаспадарчых арганізацыях, дзе праваражаць залішне вільготныя, пясчаныя і тарфяныя глебы, якія характарызуюцца высокімі каэфіцыентамі пераходу стронцыю і цэзію ў прадукцыю. Таму па-ранейшаму застаецца актуальным павышэнне эфектыўнасці мелiярватыўнага, арганічных і мінеральных угнаенняў, скіраваных як на памяншэнне пераходу іх з глебы ў расліннаводчую прадукцыю, так і на павышэнне ўрадлівасці глеб».

Старшы навуковы супрацоўнік ДНУ «Інстытута радыебіялогіі НАН Беларусі» Тамара ЛАСЬКО расказала, што зараз распрацоўваюцца рэкамендацыі па выкарыстанні вернутых у абарот зямель, ускараненні іх у гаспадарку. «Вынікамі нашай дзейнасці з'яўляецца распрацоўка кармавых дабавак для жывёл, якія прымяняюцца шляхам увядзення іх у рацыён для зніжэння перахаду радыенуклідаў — цэзію-137 і стронцыю-90. Гэта камбікормы-канцэнтраты з фэрыцыянітамі. На дадзеным этапе сумесна з Інстытутам прыродакарыстання распрацаваны беларускі сарбент, які сінтэзаваны айчыннымі навукоўцамі, — гэта вугляродны фэрыцын, ён змяшчае сарбент на аснове актываванага вугалю і торфу».

Дар'я ШЛАПАКОВА.



Пераадоленне

Крэатыўная эканоміка для пацярпелых раёнаў

Атручаныя радыяцыяй тэрыторыі становяцца пляцоўкамі для інавацыйных эксперыментаў

Чорны попел у выглядзе цэзію, стронцыю, радыеактыўнага ёду накрыў большую частку Магілёўскай і Гомельскай абласцей, запэцкаў ядавітымі плямамі Брэсцкую, Гродзенскую і Мінскую вобласці. На тэрыторыі Беларусі асела каля 70 % радыенуклідаў. Каб раёны зноў сталі прывабнымі для жыцця, за 35 паслячарнобыльскіх гадоў шмат чаго зроблена па пераадоленні наступстваў аварыі ў розных сферах гаспадарчай дзейнасці. Тут рэалізуюцца сур'ёзныя дзяржаўныя і прыватныя праекты, будуецца жыллё, адкрываюцца новыя вытворчасці, ствараюцца працоўныя месцы.

УМОВЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

Летась у Слаўгарадзе быў урачыста адкрыты мост праз раку Сож, які злучыў два берагі аднаго раёна. У 1986 годзе левабярэжная частка Сожа, дзе знаходзіцца знакамітая Блакітная крыніца, амаль цалкам была выключана з жыцця. Жыхары тутэйшых вёсак вымушаны былі змяніць месца жыхарства, а іх дамы пахавалі, бо ўзровень радыяцыі зашкальваў. Але некалькі гадоў таму жыццё тут зноў аднавілася. Зараз менавіта на гэтых землях рэалізуўаецца ўнікальны экапраект, які дазволіць прывабіць турыстаў з усяго свету.

І добрым штуршком для гэтага стаў менавіта Указ № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці», рашэнне аб стварэнні якога было прынята Прэзідэнтам у 2014 годзе. Слаўгарадскі, Краснапольскі, Чэрыкаўскі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Крычаўскі і Хоцімскі раёны, эканоміка якіх сур'ёзна пацярпела ад наступстваў аварыі на ЧАЭС, атрымалі новы стымул для развіцця.

З пачатку дзеяння ўказа ў эканоміку і сацыяльную сферу рэгіёна накіравана больш чым адзін мільярд рублёў інвестыцый у асноўны капітал, прыцягнута больш чым 37 мільёнаў долараў замежных інвестыцый. Створана 230 новых камерцыйных арганізацый, суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. На зноў створаныя працоўныя месцы з 2015 года працаўладкаваны больш чым 2,5 тысячы чалавек. Дзякуючы ўказу зроблена мадэрнізацыя цэментных заводаў па пераводзе іх на мясцовыя віды паліва. У Крычаўскім раёне ўведзена вытворчасць па вырабе цэментава-стружкавых пліт, філіялам «Дамачай» засвоена новая вытворчасць кукурузнай палачкі. У Клімавіцкім, Касцюковіцкім і Краснапольскім лясгасах пабудаваны новыя дрэваапрацоўчыя цэхі. У Краснапольскім і Чэрыкаўскім — сушыльныя камеры. У выніку толькі за апошнія пяць гадоў паўднёвы ўсход павялічыў аб'ём перапрацоўкі драўніны ў 1,6 раза. Праводзіцца работа па абнаўленні сельскагаспадарчай тэхнікі, з'яўляюцца новыя вытворчыя аб'екты. У Слаўгарадзе рэалізуўаецца вялікі інавацыйны праект бабруйскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік» па выпуску кандытарскіх вырабаў. Летась на яго слаўгарадскім філіяле запрацавала лінія па разліве мёду. У рэгіёне ўведзена ў эксплуатацыю 170 тысяч квадратных метраў жылля, з якіх больш чым 35 тысяч — летась. Палепшыліся фінансавыя вынікі дзейнасці гэтага рэгіёна. За перыяд з 2016 года да 2020-га выручка ад рэалізацыі прадукцыі на аднаго сяроднеспісачнага работніка склала па вобласці 177,6 %, а канкрэтна па паўднёвым усходзе — 214 %!

— Усё гэта сведчыць, што паўднёвы ўсход пакрысе падцягваецца да сярэднеабласных лічбаў, — адзначае **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР.** — Новы імпульс для далейшага развіцця быў дадзены летась 20 мая, калі кіраўнік краіны падпісаў дадатковы Указ № 177 «Аб мерах па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці». Гэтым указам створаны дадатковыя меры па цэламу шэрагу кірункаў.

СТАЛА БОЛЬШ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

Вялікую ролю для краіны сыграла і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, якія дапамагаюць рэалізаваць на тэрыторыі Беларусі праекты міжнародны тэхнічнай дапамогі. За апошнія сем гадоў Мінэканомікі сумесна з ПРААН рэалізавала тры буйныя праекты: «Садзейічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» (у рамках якога ў Магілёўскай вобласці атрымалі пуцёўку ў жыццё 53 ініцыятывы), «Садзейічанне занятасці і самазанятасці насельніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Рэспублікі Беларусь» (на тэрыторыях Магілёўскай і Віцебскай абласцей створана інфраструктура для падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу, распрацаваны спецыяльныя вучэбныя даведнікі па асновах прадпрымальніцтва, праведзены шэраг стартап-мерапрыемстваў і конкурсаў, ініцыятыў) і «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізоўваецца з 2019 года на тэрыторыі 12 раёнаў Магілёўскай вобласці.

— Пасля аварыі на ЧАЭС шмат хто пакінуў насіджаныя месцы, але засталіся ініцыятыўныя, — кажа дырэктар Фонду развіцця сельскіх тэрыторый Сяргей Тарасюк. — За апошнія 10 гадоў адбыўся каласальны рост ініцыятыў ад насельніцтва. Калі спачатку гэта былі нязначныя спробы развівацца праектную дзейнасць, то на сёння ў Магілёўскай вобласці болей чым 20 мясцовых арганізацый, якія райвыканкамаў актыўна прыцягваюць да рэалізацыі праектаў. Гэта прадпрымальнікі, якія працуюць у сферы бізтэхналогій і зялёнай эканомікі. Цяпер яго ўдзельнікамі з'яўляюцца 35 прадпрыемстваў, якія займаюцца выпускам аграбізтэхналагічнай прадукцыі.

— Кластар дазваляе аб'яднаць дробныя прыватныя прадпрыемствы з буйнымі вытворчымі цэнтрамі і холдынгамі, — удакладняе **дырэктар навукова-тэхналагічнага ТАА «Тэхнапарк «Палессе» Аляксей КОЗЫР.** — Паміж удзельнікамі наладжваюцца тэматычныя сувязі, якія дазваляюць стварацьканкурэнтны прадукт з высокай дабаўленай вартасцю. Прыярытэтныя кірункі — жывёлагадоўля і раслінаводства, тэхналогіі здароўя складу жыцця, «зялёная» эканоміка і турызм. Вядзецца работа з удзельнікамі кластара, даследчая дзейнасць.

Рэалізацыя кластара адкрывае магчымасць стварэння новых формузаемадзеяння: навука, бізнес, вытворчасць, адукацыя. У 2010-м ва ўніверсітэце была распрацавана тэхналогія размнажэння ягадных культур, такіх як маліна, буякі, ажыны і іншыя.

пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, тэхнапарк «Палессе», які існуе пры Палескім дзяржуніверсітэце. У 2018 годзе тут створаны інавацыйна-прамысловы кластар у сферы біятэхналогій і зялёнай эканомікі. Цяпер яго ўдзельнікамі з'яўляюцца 35 прадпрыемстваў, якія займаюцца выпускам аграбіятэхналагічнай прадукцыі.

— Каб гэтыя прадукты рэалізоўваліся, праводзім комплексную адукацыю насельніцтва і прадпрыемстваў па работе з прадукцыяй, — удакладняе Аляксей Козыр. — У 2011 годзе былі зроблены першыя закладкі буякоў, аказвалася падтрымка прадпрыемствам, якія сталі першапраходцамі. Зараз 15 прадпрыемстваў працуюць у гэтай сферы.

Зараз у рэалізацыі тэхнапарка знаходзіцца 17 праектаў. Вельмі перспектыўны з іх па стварэнні плантацыі паўлоўніі лямцавай. Плантацыі могуць быць закладзены на тэрыторыі раёнаў, якія адчуваюць ад аварыі на ЧАЭС. Пасля сямі гадоў з кожнага гектара можна атрымліваць ад 240 да 350 кубаметраў якаснай драўніны. Плануецца адкрыццё вытворчасці па выпуску палімерных біяцыдаў, якія знаходзяць шырокае прымяненне ў сельскай гаспадарцы, камунальнай сферы, выкарыстоўваюцца для адпаўлення забруджаных зямель. Яшчэ адзін праект датычыцца выкарыстання якаснай рыбнай прадукцыі — распрацавана спецыяльная тэхналогія. З аднаго кубаметра можна будзе атрымліваць за паўгода ад 200 і болей кілаграмаў карыснага прадукту.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ ЗАБРУДЖАНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ

Шмат чаго перспектыўнага і перадавога прапануюе для тэрыторый, якія пацярпелі ад радыеактыўнага забруджвання, і ўвесь свет. Напрыклад, на Слаўгарадскім палігоне ТВЁРДЫХ бытавых адходаў, які будуецца, будзе ўтылізавацца метан, які выдзяляецца пры раскладанні смецця. Ён будзе выкарыстоўвацца для выпрацоўкі электраэнергіі. Ужо ёсць і праект, які прадугледжвае ўтылізацыю ядзернага паліва, якое адпрацавала свой рэсурс на Беларускай АЭС. Ён будзе рэалізаваны ў Чэрыкаўскім раёне.

Пра ўсе гэтыя праекты можна будзе даведацца падчас Форуму рэгіёнаў, які пройдзе ў Магілёве ў верасні. Ён будзе прысвечаны пытанням пераадолення наступстваў катастрофы на ЧАЭС, развіцця пацярпелых тэрыторый.

• Кампетэнтна

Намеснік начальніка аддзела інвестыцый, па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС і надзвычайных сітуацыях камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама Сяргей ЛАЗАРЭВІЧ:

— За апошнія 10 гадоў на рэалізацыю дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў па Магілёўскай вобласці выдзелена 476 мільёнаў рублёў. Асноўныя кірункі гэтых мерапрыемстваў — сацыяльная і радыяцыйная ахова насельніцтва, медыцынскае забеспячэнне, сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых раёнаў. Створаны прадпрыемствы па развядзенні рыб каштоўных парод у Касцюковіцкім і Быхаўскім раёнах. Пабудавана газаправодаў агульнай працягласцю 340 кіламетраў і газіфікавана 3,5 тысячы жылых дамоў. Уведзена ў эксплуатацыю больш чым 20 кіламетраў водаправадной сеткі, 19 станцый абезжалезвання, дзве артэзіянскія свідравіны. На забруджаных тэрыторыях уведзена ў эксплуатацыю 44 кіламетры аўтадарог з цвёрдым пакрыццём. Пабудаваны бальніца з паліклінікай у Дрыбіне, прыбудова да сярэдняй школы № 1 у Слаўгарадзе, спартыўны комплекс у Быхаве, фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Касцюковічах і Краснаполлі, біятлоннае стрэльбішча і лыжароллерная траса ў Чавусах. Пры абласным анкадыспансеры ўзведзены радыелагічны корпус, аперацыйны блок і лабараторыі, праведзена рэканструкцыя карпусоў хіміятэрапеўтычнага і радыелагічнага аддзяленняў у паліятыўным аддзяленні хоспіса, запрацавала лабараторыя радыенуклідаў дыягностыкі.

Узровень

А МОЛАДЗЬ КРЫЛЫ РАСПАСЦІРАЕ

Характэрная для сённяшняга дня праблема — адток маладых кадраў з навукі. Толькі не ў навукова-даследчым інстытуце імпульсных працэсаў, які з'яўляецца дзяржразліковым падраздзяленнем Інстытута парашковай металургіі імя акадэміка А. У. Романа НАН Беларусі.

Лізавета ЛІПАТАВА — пакуль малодшы навуковы супрацоўнік.

— Ва ўсе часы кіраўнікі інстытута і аб'яднання імкнуліся падтрымліваць навуковую моладзь, бачылі ў ёй заўтрашні дзень свайго калектыву. Я перакананалася ў гэтым на ўласным вопыце, — расказвае **дырэктар навукова-даследчага інстытута імпульсных працэсаў з дослednай выtворчасцю доктар тэхнічных навук Ларыса СУДНІК.** У канцы студзеня наша газета расказала пра навуковы пошук, які вядзе калектыў гэтага НДІ.

— Маладыя супрацоўнікі заўсёды адчувалі падтрымку акадэміка Алега Уладзіслававіча Романа і Пятра Аляксандравіча Віцязя, — працягвае расказ Ларыса Уладзіміраўна. — А цяпер усебакова апякуе навуковую моладзь генеральны дырэктар аб'яднання, дырэктар Інстытута парашковай металургіі імя акадэміка А. У. Романа Аляксандр Фёдаравіч Ільюшчанка. І наша моладзь заслугоўвае такой увагі. Напрыклад, Уладзіслаў Сямашка, які прыйшоў да нас са сваёй тэмай — «Умацаванне рабочых органаў сельскагаспадарчых машын метадам тэрмічнай апрацоўкі». Цяпер тэма дапоўнена дадатковымі даследаваннямі, якія ўключаюць ударнае ўмацаванне метадам імпульснай апрацоўкі з дапамогай энергаёмістых выбуховых матэрыялаў. Ужываюцца таксама слаістыя матэрыялы, атрыманыя зваркай выбухам. Нядаўна Уладзіслаў атрымаў прэмію Жарэса Алфёрава, ён адзін з першых лаўрэатаў гэтай прэміі, якую заснавалі прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Але далей нязвыкшае сам.

Выбух бывае... стваральным

— У інстытуце я з 2012-га. Вучыўся ў БДАТУ, там скончыў і аспірантуру, — падсумоўвае пражытыя гады **Уладзіслаў СЯМАШКА.** — Пачынаў маладшым навуковым супрацоўнікам, потым вырас да навукоўца супрацоўніка, намесніка загадчыка лабараторыі. І вось ужо другі год працую загадчыкам лабараторыі.

Асноўная тэматыка, якой займаемся, — зварка выбухам. Злучэнне чорных і каляровых металаў і іх спалучэнняў. Гэта той выпадак, калі выбух выкарыстоўваецца для атрымання цэлага класа новых матэрыялаў. Шмат беларускіх прадпрыемстваў выкарыстоўваюць нашу прадукцыю. Таксама займаемся кансалідацыяй парашковых матэрыялаў з дапамогай выбуху, атрыманнем кампактаў. Даследаванні носяць прыкладны характар.

Калі канкрэтызаваць, то прэмію Жарэса Алфёрава атрымаў за выраб камуляцыйных падоўжаных зарадаў. Тэматыка цікавая, заказаў шмат, так што і працаваць цікава.

У лабараторыі больш за 20 спецыялістаў, сярод іх шмат моладзі, як і аксакалаў — людзей вопытных, што дапамагаюць маладым. Асабліва цёплыя словы хачу сказаць пра дактара навук Генадзя Васілевіча Смірнова і былога загадчыка лабараторыі Ігара Валянцінавіча Пятрова. Па сутнасці, яны найлепшыя настаўнікі на працоўным месцы. А кіраўнік маёй дысертацыі — генеральны дырэктар аб'яднання член-карэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр Фёдаравіч Ільюшчанка. Старэйшыя таварышы шчыра дзеляцца ведамі, а пры нашай вельмі спецыфічнай работе таму цяжка пераацаніць.

У кожнага ёсць адзіная кніжка ўзрыўніка, а ў мяне шэсць — і кніжка кіраўніка ўзрыўных работ. Каб ажыццявіць зварку ўзрывам, патрэбна выканаць падрыхтоўку ўсіх матэрыялаў, кампанентаў, плюс апрацоўка лістоў перад іх зваркай, і ўсё гэта даволі тонкая справа, у якой патрэбна разабрацца.

Вы пытаецеся, ці ўсё ёсць для навуковай работы. У інстытута былі праблемы з фінансаваннем, а таму — і з камплектаваннем кадрамі — маладыя спецыялісты не затрымліваліся. У апошнія гады назіраецца прыток выпускнікоў тэхнічных ВНУ, ідзе нават адбор найлепшых. Працоўныя месцы на дослednай выtворчасці (палігоне) абсталяваны належным чынам, для работы і даследаванняў ёсць умовы і абсталяванне. Важна і тое, што абяднанне — Інстытут парашковай металургіі — валодае значнай дослednай базай, і мы маем магчымасць карыстацца ёю. Лічу, гэта найлепшая ў краіне дослednая база, якая акрэдытавана па ўсіх кірунках.

Тое, што нас аб'ядноўвае, — работа вельмі падабаецца ўсім маладым спецыялістам. Ніхто не глядзіць на гадзіннік: калі ўжо абед ці калі збірацца да хаты? Адчуваецца захопленасць справай. На мой погляд, наша лабараторыя — адна з самых моцных у аб'яднанні.

Палімер мацней за метал

Да гутаркі далучаецца **маладшы навуковы супрацоўнік Лізавета ЛІПАТАВА,** нядаўняя выпускніца тэхналагічнага ўніверсітэта.

— У інстытуце я была яшчэ студэнткай на пераддыпломнай практыцы. У сябе ва ўніверсітэце працавала адначасова стажорам малодшага навуковага супрацоўніка і зразумела, што навука цікавіць мяне больш, чым выtворчасць.

Пачынала тэхнікам на палову стаўкі, а пасля завяршэння вучобы працую інжынерам на поўную стаўку. Займаюся даследаванямі ў галіне палімерных кампазіцыйных матэрыялаў — гэта вельмі перспектыўны накірунак. З палімераў можна зрабіць усё: ад рыбалоўных вуд да лопасцяў самалёта. Так што прастора для даследаванняў надзвычай вялікая. Займаюся поліўрытанам. З яго рэальна можна стварыць што заўгодна, а не толькі прывычныя для ўсіх падэшвачкі начоткага абутку. Ён вытрымлівае высокія тэмпературы і настольныя трывалы, што можа працаваць там, дзе не спрацяваюць нават метал. Плюс кампаненты да яго ўсялякія — разнастайныя напаўняльнікі. Можна займацца гэтай тэматыкай усё жыццё і не здаволіцца.

Дапамагаюць працаваць Ларыса Уладзіміраўна, Генадзь Васільевіч, Ігар Валянцінавіч, а таксама Уладзіслаў Сямашка, мой загадчык лабараторыі.

З тэмай дысертацыі пакуль не вызначылася толькі тэму, што перспектыўных тэм многа, і вось разбягаюцца. Для работы ўсё ёсць. Калі нечага не хапае, даволі хутка набываецца.

Пляцюўкі для работы з рэактывамі абсталяваны на палігоне, і я там часта бываю. Працую з ахвотай.



Уладзіслаў СЯМАШКА і яго настаўнікі Генадзь Васільевіч СМІРНОЎ і Ігар Валянцінавіч ПЯТРОЎ.

У калектыве сапраўды шмат моладзі, і разам нам камфортна.

Пераманілі з аўтамабільнага завода

Яшчэ адзін суразмоўца пасля БНТУ працаваў у кавальска-тэрмічным цэху аўтамабільнага завода і прайшоў шлях ад майстра да намесніка начальніка цэха па выtворчасці. Знаёмцеся: **Канстанцін РУДНІЦКІ.**

— Работа ў цэху была ў радасць, у той жа час патрабавала поўнай аддачы і шмат часу. Існавала велізарная адказнасць: за спінай жа — 150 чалавек. Але галоўнае — адчуў, што мне ўсё ж бліжэй навука. Можа таму, што мой бацька працуе ў політэхнічным універсітэце загадчыкам лабараторыі, ён кандыдат тэхнічных навук, дацэнт гэтай паважанай альма-матар для многіх выtворцаў і навуковых кадраў. У ліку іншых тэм ён распрацоўваў і тэматыку ўмацавання сталяў наначасцінкамі, што мне таксама было зайсёды цікава.

Вызначыўся з кандыдацкай дысертацыяй: «Кампазіцыйныя матэрыялы на аснове алюмініевых і магніевых сплаваў, арміраваныя тугаплаўкімі наначасцінкамі». Даследаванні таксама носяць прыкладны характар, бо шмат дагавораў, і патрэбна ўлічваць інтарэсы заказчыкаў, зацікаўленых у павышэнні якасці прадукцыі. У дадзеным выпадку інтарэсы кардынальна супадаюць.

Мой навуковы кіраўнік — Ларыса Уладзіміраўна. Сачу за распрацоўкамі ў сваёй галіне замежных навукоўцаў. Імкнуся наведваць тэматычныя канферэнцыі і выстаўкі за мяжой. Стасунку з калегамі ў нечым падпамагаюць. Ва ўсялякім разе, стараемся не адставаць.

На палігоне апошнім часам асвойваем новую машыну для ліцця пад ціскам.

Вядома, матэрыяльную базу пажадана падшырыць, нейкія пытанні ёсць, яны вырашаюцца. Як ужо зазначаў Уладзіслаў, у нас у аб'яднанні вельмі моцны дослednы цэнтр, і калі патрэбна правесці даследаванні, то цалкам рэальна. Усё праводзіцца аператыўна і якасна.

Падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, і Яўген ПЯСЕЦКІ *(фота).*

З «БАЗАЙ» У ГАЛАВЕ

Запраграмаваныя на фінал

Каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ адзінае ад Беларусі здолела прабіцца ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў. У яе склад увайшлі другакурснік Аляксей Філіновіч, чацвёртакурснікі Яфім Клімашэўскі і Антон Палюховіч.

У паўфінале спаборніцтваў хлопцы заваявалі бронзавы медаль. Усяго ўдзельнікамі паўфіналу сталі 48 камандаў з Беларусі, Расіі, Казахстана, Кіргізіі, Грузіі, Узбекістана і Латвіі. Нашу краіну прадстаўлялі тры зборныя БДУ і адна — ДДУІР. Дарэчы, на рахунку БДУ таксама два дыпломы другой ступені.

Кожнай камандзе з трох чалавек быў дадзены адзін камп'ютар. На рашэнне 11 задач на англійскай мове давалася пяць гадзін. Студэнты распрацоўвалі алгарытм, даводзілі яго аптымальнасць і пісалі праграму на адной з моў праграмавання. Правільнасць рашэння праверялі з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы. Перамога прысуджалася камандзе, якая рашыла найбольшую колькасць задач за найменшы час.

Чэмпіянат свету па праграмаванні сярод студэнтаў з'яўляецца найбуйнейшым міжнародным спаборніцтвам маладзёжнай эліты сусветнага праграмавання. Беларускія каманды ўдзельнічаюць у ім з 1995 года. За ўсю гісторыю ўдзелу скарбонку праграмістаў з БДУ папоўнілі залаты медаль, «бронза» і дзве сярэбраныя ўзнагароды. Пры гэтым БДУ з'яўляецца пастаянным удзельнікам фінальных выступленняў.

Фінал чэмпіянату свету па праграмаванні 2021 года пройдзе восенню. Фармат спаборніцтваў вызначаць у найбліжэйшы час.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДРУКАВАНАЕ СЛОВА — МАГУТНАЯ ЗБРОЯ

Навучальны дапаможнік «Беларуская журналістыка ў гады Другой сусветнай вайны (1939—1945)» выдадзены ў БДУ.

Кніга паказвае аб'ектыўную карціну патрыятычнай барацьбы падпольных і партызанскіх выданняў, а таксама дае аналіз малавядомых публікацый ваеннага часу.

Аўтарамі дапаможніка выступілі дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Пётр Дарашчонак і дацэнт кафедры міжнародной журналістыкі факультэта журналістыкі Алена Конанава.

У кнізе 200 старонак тэкставага матэрыялу і больш як 150 ілюстрацый. У тэматычных раздзелах апублікавана ўнікальная інфармацыя аб дзейнасці прэсы ў Заходняй Беларусі. У дадатку выкарыстаны архіўныя матэрыялы. Напрыклад, невядомыя публікацыі з газет і часопісаў Заходняй Еўропы, ЗША і іншых краін, якія асвятлялі падзеі Другой сусветнай вайны, выказваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходняю Беларусь і Заходняю Украіну, гераічную барацьбу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Выпуск выдання прымеркаваны да 75-годдзя Перамогі над фашызмам у Другой сусветнай вайне і 100-годдзя БДУ.

Вучэбны дапаможнік у хуткім часе можна будзе набыць у краме «Універсітэцкая кніга» (праспект Незалежнасці, 4, галоўны корпус БДУ), а таксама ўзяць у Фундаментальнай бібліятэцы Белдзяржуніверсітэта.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дырэктар інстытута Ларыса Уладзіміраўна СУДНІК і Канстанцін РУДНІЦКІ.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: совместное общество с ограниченной ответственностью «Центральная продовольственная компания» (СООО «ЦПК»), УНП 690576472, дело №118-11Е/2020 Экономический суд г. Минска, в лице антикризисного управляющего ИП Колотиловой Т. А., тел. +375 (29) 550-94-84.

Четвертые повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **14 мая 2021 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Лот, №	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	13176	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 6274-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049143 X96330900B1001229, цвет белый	6 300,00	5 600,00
2	13177	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 6273-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049145 X96330900B0999016, цвет белый	6 300,00	5 600,00
3	13178	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 9996-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049115 330900B0995742, цвет белый	4 680,00	4 160,00
4	13180	Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АМ 3270-5, 2012г. в., кузов(рама) № Y3H47380C0062721 X96330900C1023567, цвет белый	7 110,00	6 320,00
5	13195	Грузовой фургон-рефрижератор MAN TGA 26.410, рег. знак АО 5455-5, 2003 г. в., кузов (рама) № WMAH20ZZZ4M374264, цвет синий	32 310,00	28 720,00
6	13200	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-C41R33 KUPAVA 47N800, рег. знак АО 6611-5, 2014г. в., кузов (рама) № Y3H47N800F0068792 X96C41R33F1057875, цвет серебристый	26 820,00	23 840,00
7	13202	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-C41R33 KUPAVA 47N800, рег. знак АО 6740-5, 2015г. в., кузов(рама)№ Y3H47N800F0069180 X96C41R33F1059414, цвет серебристый	29 520,00	26 240,00
8	13203	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-C41R13 KUPAVA 47N800, рег. знак АТ 4166-7, 2018г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0073119 X96C41R13J1093858, цвет белый	34 380,00	30 560,00
9	13206	Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-C41R13KJPAVA 47N800, рег. знак. АТ 4024-7 2018г. в., кузов(рама) № Y3H47N800J0073173 X96C41R13J1093853, цвет белый	34 380,00	30 560,00
10	13208	Машина для нарезки сыра STORM	10 710,00	3 060,00
11	13209	Настольные весы Ergeta ES 2012	6 700,00	1 940,00
12	13210	Погрузчик электрический TCM с зарядным устройством (Япония)	13 860,00	7 920,00
13	13211	Пароменочная машина COMAC L 22B CB (Италия)	2 100,00	1 200,00

Местонахождение: п. 1-9 – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, п. 10–13 – Минский р-н, аг. Сеница. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 26.04.2021 09.00 по 13.05.2021 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Обременения отсутствуют. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор не позднее 5 календарных дней со дня проведения торгов, заключить договор купли-продажи в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 19.03.2021.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

1-й очередь строительства 1-я секция в составе объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской, ул. Плаговлева, пр-т. Жукова» в г. Минске, опубликованную в газете «Минский курьер» от 20.12.2019 № 145 (3359).

Этапы и сроки реализации строительства: строительство объекта предусматривается в 3-й очереди, начало строительства 1-й очереди – декабрь 2019 г., завершение строительства 1-й очереди – август 2021 г.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию: август 2021 г.

УНП 191581623

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе

ЛОТ 1: автобус вагон МАЗ – 241030, 2013 г. в., гос. № АК 0554-4, vin Y3M241030D0000017. Начальная цена продажи лота 31 872 руб. (тридцать одна тысяча восемьсот семьдесят два рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 187 руб. (три тысячи сто восемьдесят семь рублей)

ЛОТ 2: грузовой автомобиль платформа тентовая МАЗ 437130 332, 2009 г. в., гос. № АВ 2549-4, vin Y3M437130900000217. Начальная цена продажи лота 11 424 руб. (одиннадцать тысяч четыреста двадцать четыре рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 142 руб. (одна тысяча сто сорок два рубля)

ЛОТ 3: автомобиль грузовой фургон изотермический GAZ – 33106 «Белава-420», 2012 г. в., гос. № АЕ 5429-4, vin 331040C0025325, X96331060C1023208. Начальная цена продажи лота 17 125,10 руб. (семнадцать тысяч сто двадцать пять рублей десять копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 712 руб. (одна тысяча семьсот двенадцать рублей)

ЛОТ 4: грузовой специальный подъемник гидравлический ZIL 431412, 1990 г. в., гос. № АА 0539-4, vin L2990381, подъемник ВС 22-01. Начальная цена продажи лота 9 984 руб. (девять тысяч девятьсот восемьдесят четыре рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 998 руб. (девятьсот девяносто восемь рублей)

ЛОТ 18: автоприцеп ДЗ-122-1, заводской номер 118126, 1982 г. в. Начальная цена продажи лота 7 776 руб. (семь тысяч семьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 777 руб. (семьсот семьдесят семь рублей).

Продавец – открытое акционерное общество «Лакокраска», 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, тел. 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества (в размере 119,79 руб. по Лотам № 1-4; 131,04 руб. по Лоту № 18).
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 7 мая 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.03.2021 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 5 мая 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 2: капитальное строение с инвентарным номером 442/С-12130 (назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, наименование – скотоубойный пункт с колбасным цехом), общей площадью 1911,2 кв. м, расположенное по адресу: Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Ленинская, 1Г.

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 4246813066010000568, площадью 1,0541 га (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции (обслуживания скотоубойного пункта, колбасного цеха)), расположенном по адресу: Островецкий р-н, Гудогайский с/с, п. Гудогай, ул. Ленинская, 1Г. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), площадью 1,0483 га; на природных территориях, подлежащих специальной охране (в прибрежной полосе реки, водоема), площадью 0,0058 га.

Начальная цена продажи лота – 105 600 р. (сто пять тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 10 560 р. (десять тысяч пятьсот шестьдесят рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Островецкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231201, г. Островец, ул. Ленинская, 12, Тел. 8-01591-286-72

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 12 мая 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.09.2020 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 06 мая 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению ОАО «Солигорагропром» *(продавец)* проводит повторный открытый аукцион по продаже помещения магазина № 34 *(составные части и принадлежности: пристройка из металлопрофиля с металлической крышей, навес с жёстоной крышей на металлических столбах, рампа бетонная с жёстоным навесом на металлических столбах, крыльцо бетонное)* **с инв. № 644/D-30188 общей площадью 770,7 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 58А, и системы автоматической пожарной сигнализации (инв. № по бух. учету 34-169). Сведения о земельном участке: кадастровый номер 625050100001002601, площадь – 0,2459 га, доля в праве – 11/50.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 821 760,00 бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 82 176,00 бел. руб.)

Договор аренды по 11.11.2021, арендуемая площадь – 4 кв. м, расположен банкомат.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600193330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата производится в следующем порядке:

- 40 (сорок) процентов стоимости имущества оплачиваются в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 60 (шестьдесят) процентов – в течение 3 (трех) календарных месяцев (по 20 %) с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере – 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объекта). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 17.03.2021. Аукцион состоится **12.05.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.05.2021** до **15.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 029 136-31-11.**

УНН 600122715

Антикризисный управляющий ООО «МАГНУС групп» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 27.05.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по реализации доли в уставном фонде совместного общества с ограниченной ответственностью «БелПолиПлекс» (УНП 691074482). Первоначальная цена доли в уставном фонде совместного общества с ограниченной ответственностью «БелПолиПлекс» составляет 990,00 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 26.05.2021. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 27.05.2021 на р/с ООО «МАГНУС групп» р/с BY08PJCB30120146281010000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 110, код PJCBBY2X, УНП 191112191.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 10 дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения».

zepter bank

Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б,
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

Данная финансовая отчетность размещена на сайте **www.zepterbank.by**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2021 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	2 696	2 315
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	18 117	13 810
5	Средства в банках	1104	19 294	20 637
6	Ценные бумаги	1105	7 936	7 827
7	Кредиты клиентам	1106	100 086	105 105
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	15 139	15 290
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	2 130	2 142
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	9 448	10 749
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	3 404	3 028
15	ИТОГО активы	11	178 250	180 903
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	1 800	-
18	Средства банков	1202	5 703	6 146
19	Средства клиентов	1203	117 237	121 624
20	Ценные бумаги банка	1204	5 359	5 391
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	884	793
24	ВСЕГО обязательства	120	130 983	133 954
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	18 817	18 817
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	1 495	1 495
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	11 335	11 342
30	Накопленная прибыль	1215	15 620	15 295
31	ВСЕГО собственный капитал	121	47 267	46 949
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	178 250	180 903

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2021	01.01.2020
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	2 178	1 925
2	Процентные расходы	2012	1 199	857
3	Чистые процентные доходы	201	979	1 068
4	Комиссионные доходы	2021	484	440
5	Комиссионные расходы	2022	84	79
6	Чистые комиссионные доходы	202	400	361
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	(1)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	729	449
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	1	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(10)	1 702
12	Прочие доходы	208	1 682	915
13	Операционные расходы	209	3 291	2 386
14	Прочие расходы	210	106	151
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	404	(1 447)
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	87	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	317	(1 447)

Зам. Председателя Правления Охрименко Павел Александрович

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания: 1 апреля 2021 г.

Сямейны адпачынак

У музей з пашпартам

Сталічныя музеі запускаюць культурна-пазнавальны праект «Музейныя лабірынты. Час сямейных адкрыццяў», падчас якога з рознымі фактамі гісторыі, літаратуры, мастацтва наведвальнікі будуць знаёміцца пры дапамозе квэстаў і інтэрактыўных праграм, прычым у камандзе з самымі блізкімі людзьмі. Невыпадкова праект нацэлены на сем'і — усё ж пандэмія прымушае шукаць найбольш бяспечныя формы экскурсій. Да таго ж для бацькоў гэта выдатная падказка, як цікава і карысна правесці час з дзецьмі.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наведвальнікі сустрэнуцца з партызанамі, пазнаёмяцца з іх побытам і будуць вучыцца сакрэтам выжывання і нават вырабляць чарнілы, каб напісаць ліст у іншы атрад. У Музеі гісторыі Мінска госці даведаюцца пра першы грамадскі транспарт — конку.

Не так даўно адчынілася пасля рамонту Беларуская хатка, дзе, удзельнічаючы ў музейных прыгодах, дзеці і дарослыя змогуць больш даведацца пра класікаў, юбілеі якіх мы сёлета будзем адзначаць, — Максіма Багдановіча і Змітрака Бядулі. У Дзяржаўным літаратурным музеі імя Янкі Купалы трэба будзе адшукаць артэфакты, якія сведчаць пра захапленні беларускага песняра (а гэта і музыка, і мода, і рыбалка). У адзіным музеі-кватэры (Літаратурны музей імя Петруся Броўкі) давядзецца пераварыцца ў дэтэктывазі і ўважліва шукаць падказкі ў музейнай экспазіцыі. Сваю праграму падрыхтавалі і Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. Маляўнічыя даведкі, якія атрымаюць удзельнікі гульні, дапамогуць не заблукаць у музейных лабірынтах.

Распачаць гульню можна з любога музея. У першым з іх каманда атрымае пашпарт, куды будуць ставіцца пячаткі пасля праходжання кожнага з лабірынтаў. Сямейныя каманды атрымаюць памятныя сувеніры, а каманды, якія да 23 мая пройдуць усе шэсць музеяў, паўдзельнічаюць у розыгрышы суперпрыза — сямейнай вандроўкі па Беларусі ад генеральнага партнёра праекта — Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ВЕКАВЫ ЮБІЛЕЙ ВЕТЭРАНА

Днямі Іван Іванавіч Курындзін адсвяткаваў 100-гадовы юбілей. Ветэран-артылерыст у складзе 1-га Беларускага фронту вызваляў Беларусь ад фашыстаў. За бой пад Рагачовам атрымаў медаль «За адвагу». Перамогу сустрэў у Берліне.

З векавым юбілеем Івана Іванавіча прыйшлі павіншаваць прадстаўнікі Адміністрацыі Савецкага раёна Мінска, ваенкамата, грамадскіх аб'яднанняў. І, вядома, блізкія людзі. На фота Іван КУРЫНДЗІН з дачкой Галінай ЛЯШУК. Дарэчы, Галіна Іванаўна да выхаду на пенсію ўзначальвала архіў Мінскай вобласці.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

З нагоды

У ВЯНОК МАКСІМУ

Як рыхтуюцца да юбілею Багдановіча музеі, прысвечаныя творчасці паэта

Для беларускай культуры сёлета ёсць дзве важныя даты. Першая — 130-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Паэта, які стварыў свае вершы ў духу неарамантызму, яскрава спалучаў паміж сабой і вобразы з міфалогіі, і любоўную лірыку, і мастацкую самарэфлексію. Багдановіча нездарма адносяць да шэрагу пісьменнікаў, якія найбольш паўплывалі на фарміраванне сучаснай беларускай літаратуры. Другая дата, якую таксама трэба адзначыць, — гэта 40-годдзе Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, дзейнасць якога палягае ў захаванні творчай спадчыны паэта.

На адмысловай прэс-канферэнцыі расказалі, як рыхтуюцца да юбілею, які будзе адзначацца ў снежні.

Загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл БАРАНОЎСКІ акрэсліў вынікі работы і падзяліўся планамі наконт юбілейнага года:

— Год мы распачалі кніжнымі здабыткамі — гэта плён работы музейных супрацоўнікаў за даволі доўгі перыяд. У першую чаргу назаву каталог аўтографаў Максіма Багдановіча, тут сабраныя ўсе вядомыя на дадзены момант аўтографы паэта. Выданне даступнае ў электронным варыянце на сайце Музея гісторыі беларускай літаратуры, чым філіялам мы з'яўляемся. Таксама мы змаглі працягнуць серыю, што была распачата яшчэ ў дзевяностыя гады. Гэта выданне архіўных матэрыялаў, якія датычацца жыцця і творчасці Багдановіча. У новым выданні сабрана эпісталярная спадчына найбліжэйшага атачэння паэта, яго сваякоў. Праз ліставанне мы даведваемся пра жыццё яго сям'і. Спадзяёмся, што ў гэтым годзе мы падрыхтуем чацвёртыі сшытак архіўных матэрыялаў, прысвечаных ушанаванню памяці Максіма Багдановіча. Таксама мы збіраем інфармацыю для выдання каталога матэрыяльнай спадчыны, якая засталася ад паэта і яго сям'і. Гэтыя рэчы раскіданыя па розных установах Беларусі. Спадзяёмся, што вынікам плённай работы будзе кніга-падсумаванне таго, што захавалася ад Максіма Багдановіча ў матэрыяльным плане.

Галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП расказаў аб выданні кніг, прысвечаных творчасці паэта:

— Сёлета ў выдавецтве запланаваны чатыры кнігі, прысвечаныя творчасці Максіма Багдановіча. Сярод іх — першая кніга серыі, якую мы толькі распачалі і якая называецца «Народная бібліятэка». Серыя незвычайная тым, што ўключаныя ў яе першы выпуск творы Багдановіча былі прапанаваныя нашымі чытачамі. Гэтая кніжка ўжо здадзена ў друк...

Але работа музея не абмяжоўваецца межамі краіны. Аб міжнародназй дзейнасці і інтэрактыўных культурніцкіх праектах распавяла **Ірына МЫШКАВЕЦ — вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.** Асобна яна спынілася на сувязях з Яраслаўлем — нагадаем, што ў 1908 годзе сям'я Багдановічаў пераехала туды, дзе Максім пайшоў у шосты клас гімназіі, і сёння ў Музеі гісторыі Яраслаўля існуе як філіял дом-музей Максіма Багдановіча.

— Зносіны з Яраслаўлем у нас пастаянныя, і яны ніколі не спыняліся. Экспазіцыя дома-музея паэта, які створаны там, у асноўным складаецца з экспанатаў фонду Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Таксама мы плённа супрацоўнічаем з сістэмай дзіцячых бібліятэк з бяром удзел у штогадовых міжнародных канферэнцыях. Падтрымліваем кантакты з Яраслаўскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам, дзе захоўваецца адзін аўтограф Максіма Багдановіча. Цесныя сувязі звязваюць наш музей і з Нижнім Ноўгарадам. Там жывуць нашчадкі родных Багдановіча, якія працуюць над сямейным архівам і найбольш каштоўныя матэрыялы дасылаюць нам у электронным выглядзе.

Гродна таксама не забываецца пра літаратурную спадчыну. **Загадчык літаратурнага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Алена РАПІНЧУК** расказала аб мерапрыемствах, прысвечаных юбілейным датам. Гэта і візуальны праект «Гарадзенцы — Багдановічу», заснаваны на відэазапісах твораў, напісаных гродзенскімі пісьменнікамі, прысвечаных паэту. І віртуальны праект «Максім Багдановіч на мовах свету», падчас якога студэнты медыцынскага ўніверсітэта прачыталі «Раманс» на сямі мовах свету.

Такім чынам, 130-годдзе з дня нараджэння паэта абяцае быць насычанае на культурніцкія і міжнародныя літаратурныя падзеі. Самае цікавае яшчэ наперадзе.

Арына КАРПОВІЧ.

Каб памяталі

Горкае рэха вайны

У Беларусі вялікая ўвага ўдзяляецца ўтрыманню ў належным стане мемарыялаў. Робіцца многае, каб усё менш заставалася невядомых пахаванняў. Як актывізаваць працэс? Гэтае і іншыя актуальныя пытанні нядаўна абмяркоўвалі ў Віцебску. Тут адбыўся рэспубліканскі вучэбна-метадычны семінар па пытаннях увекавечання загінулых пры абароне Айчыны і захавання памяці аб ахвярах вайны.

Арганізавалі семінар галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, а таксама ўпраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Выконваючы абавязкі начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Пётр ГНУЦЕНКА адзначыў, што прыехалі прадстаўнікі ўсіх абласцей — каля сямідзесяці чалавек. Гэта работнікі аблвыканкамаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, райвыканкамаў Віцебшчыны, міністэрстваў культуры і абароны, пошукавікі. І ў такім прадстаўнічым фармаце адпаведная тэматыка ў Віцебску абмяркоўваецца ўпершыню, падкрэсліў прадстаўнік аргкамітэта мерапрыемства.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ПЕНІН падкрэсліў важнасць дзейнасці ўсіх, хто займаецца святой тэмай увекавечання памяці герояў і ахвяр вайны. У Прыдзвінскім краі, паводле слоў віцэ-губернатара, робіцца шмат для рэканструкцыі мемарыялаў. У рыбаўтнасці, работы правялі на комплексах: «Прарыў» — ва Ушацкім раёне, «Рыленкі» — Дубровенскім раёне, «Шапуры» — Віцебскім... І запланавана яшчэ зрабіць усё неабходнае там, дзе спатрэбіцца.

Прысутным растлумачылі методыку пошуку і ўстанаўлення звестак аб тых, хто загінуў, знік без вестак. Гаварылі і пра дзяржаўны ўлік воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны, добраўпарадкаванне брацкіх магіл. Асобная тэматыка — вядзенне аўтаматызаванага банка даных «Кніга памяці Рэспублікі Беларусь».

Што наконт пошукавай работы, сёлета запланавана правесці абследаванне на амаль 150 палявых аб'ектах. Прыкладна ў паўтара раза больш, чым летась. Пра гэта расказаў **начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны Узброеных Сіл палкоўнік Сяргей ВАРАНОВІЧ.**

Дзякуючы знаходкам, у 2020 годзе ўдалося ўстанавіць каля трыццаці прозвішчаў тых, хто загінуў. А ўсяго летась у інфармацыйным банку з'явіліся даныя пра амаль 13 тысяч загінулых. Каля чатырохсот грамадзян не толькі з Беларусі пажадалі даведацца пра лёс сваіх сваякоў, і ўсім пастараліся дапамагчы.

Сяргей Варановіч падзякаваў тым, хто паведамляе пра меркаваныя, значыць, раней не ўлічаныя воінскія пахаванні. Пасля таго як 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь правярае адпаведную інфармацыю, у амаль 90 % выпадках яна знаходзіць пацвярджэнне. У прыватнасці, тольк летась экзгумавалі астанкі каля 880 загінулых. На традыцыі цырымоніі пахавання праводзяцца ва ўрачыстай атмасферы з воінскімі ўшанаваннямі.

Удзельнікі семінара не раз агучылі ўпэўненасць у тым, што да пошукавай работы трэба актыўней прыцягваць падлеткаў і моладзь. Каб ведалі, што дзеля іх жыцця і будучыні назаўжды застаялся ў беларускай зямлі вялікая колькасць людзей. І многія былі равеснікамі або трохі старэйшымі.

Кіраўнік Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова Ірына ШЫШКОВА распавяла пра каласальны аб'ём работы па ўстанаўленні імён тых, каму мы абавязаны свайі свабодай ад нямецка-фашысцкай чумы. За дзесяць гадоў у выніку карпатлівага вывучэння сайтаў з прозвішчамі загінулых, архіўных дакументаў, інфармацыі ваенных камісарыятаў стала вядома пра прыкладна 35 тысяч чалавек. Музейшчыкі працуюць над стварэннем інтэрнэт-рэсурса «Кніга памяці Віцебскай вобласці». Там можна будзе знайсці інфармацыю пра тых, хто загінуў. У Прыдзвінскім краі, дарэчы, увекавечылі памяць прыкладна паловы з тых, хто не пашкадаваў жыцця для Перамогі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Асобы

Іза Заслонава:

«ТАТА ПРОСТА НЕ МОГ ПЕРАМАГЧЫ ТОЕ, ШТО ІМ РУХАЛА»

Гісторыю жыцця і гераічнага подзвігу Канстанціна Сяргеевіча Заслонава ведае не адно пакаленне. Ён — камандзір партызанскага атрада ў Оршы, Герой Савецкага Саюза — прыклад мужнасці і гераізму для многіх. Але гэты чалавек таксама быў сынам, мужам, бацькам. Аднак гэтыя факты біяграфіі ў пэўнай меры сыходзяць на другі план, хоць не пакідае думка: а можа, без абставін асабістага жыцця і не было б таго Героя, якому цяпер прысвячаюць фільмы, пра якога пішуць кнігі і складаюць песні. Сваё бачанне біяграфіі бацькі ёсць і ў яго дачкі Ізы Заслонавай. Яе кніга «Памяць бацькі», якую аўтар пазней перавыдала пад назвай «Герояміі нараджаюцца», распавядае пра яго жыццёвы шлях і дае магчымасць убачыць чалавека, якому было наканавана шмат выпрабаванняў, але ён паспеў за кароткі час зрабіць важкі ўклад у гісторыю краіны, хоць і паплаціўся за гэта ўласным жыццём і пакінуў сям'ю без мацнага пляча...

— Пра Канстанціна Заслонава — яго мы ў сям'і заўсёды кажам «наш дзед» — складзена шмат песень, пазм, вершаў. Памятаю, я слухала некаторыя з іх падчас святкавання 100-годдзя бацькі і плакала. Стольким людзям, і нават зусім юным, ён запаў у сэрца.

І я пішу для таго, каб людзі чыталі і разумелі, для чаго аддаў жыццё мой бацька. Ён верыў у светлую будучыню, але ўсведамляў, што толькі настойлівая праца можа нас туды прывесці. Ён настолькі ў гэта верыў... Калі ўжо рыхтавала кнігу пра бацьку да перавыдання, то азнаёмілася са шматлікай літаратурай па прызначэнне. Аказваецца, усё ў нашым жыцці наканавана. Можа, заўважалі: калі з'яўляецца востраа неабходнасць у нечым, то абавязкова чалавек патрэбнае выходзіць. Тая ж гісторыя і з героямі. Я веру ў тое, што мой бацька быў «запланаваны» вышэйшымі сіламі такім героем. І кожны перыяд яго жыцця таксама з'яўляецца подзвігам. Ёсць жа яшчэ і такая рэч, як подзвіг кожнага дня, калі чалавек пераадольвае сябе, уласнае «не хачу» і «не ўмею», а потым гэтыя маленькія крокі перарастаюць у вялікія здзяйсненні. Але ніхто не ведае, што атрымаецца ў выніку. Таму я і ўнесла змяненні ў назву кнігі і ў некаторыя раздзелы. Пры напісанні кнігі я адкрывала для сябе ату наноў. Усё з нуля, паступова па палічках раскладала, аналізавала...

— Вывучаючы біяграфію вашага бацькі, дакладна разумееш: ён з тых, для каго праца была ў прыярытэце. Як гэта адбівалася на сям'і?

— Тады будаваўся сацыялізм, новая краіна, і ўсе былі напоўнены энтузіязмам. І для бацькі было самае галоўнае, што сваёй працай ён спрыяў уздыму краіны. Яго ж куды толькі не пасылалі на працу. Супалі час і асоба... А вось маме з двума дзецьмі на руках пры адсутнасці бацькі было складана. У тым ліку і пасля яго сыходу. Аднак у рэшце рэшт усе зразумелі і прынялі, што, відаць, іначай не магло быць. Бо, па-першае, у ім была закладзена патрэба падзвігу, а па-другое, трэба было прабачаць, таму што мама, хоць і папракала бацьку, але моцна яго кахала. Тата проста не мог перамагчы тое, што ім рухала.

— Вы не думалі, як бы магло склacціся ўсё, калі б лёс Канстанціна Заслонава быў іншы?

— У дзяцінстве такое здаралася, але з узростам многае бачыцца ў іншым ракурсе, з іншых пазіцый. Цяпер мне дакладна стала ўсё зразумела, і я яго выбар цалкам падтрымліваю.

К. С. Заслонаў у Маскве пасля вяртання з Далёкага Усходу (1934 год).

— А ваша мама ў чым для вас стала прыкладам?

— Маці — жанчына з няпростым і неадназначным лёсам. Але для мяне яна — чалавек, які змог выстаяць і даў нам, дзецям, адукацыю, падняў нас. Вядома, ёсць шмат моментаў, у якіх я з ёй не згаджалася, але тое проста жыццёвыя дробязі ў параўнанні з тым, праз што ёй давялося прайсці...

— Дарэчы, пра адукацыю, вы пайшлі вучыцца ў медыцынскі інстытут, але па жыцці рэалізоўваеце сябе як мастак і пісьменніца...

